Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выка[illegible] [illegible]СР.

10 год выданьня.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 182 (2671) Нядзеля, 11-га жніўня 1929 г.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок пашпарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к.
За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй.
Зьмы тэрміну бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. радок.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

Праб'юць сьцяну маны.

Да прыезду дэлегацыі працоўных з Польшчы.

Пралетарыят Савецкага Саюзу спаткаў дэлегацыю рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Гэта падзея характэрна тым, што яна адзначае цягу працоўных Польшчы да наладжаньня прыяцельскай сувязі з працоўнымі Савецкага Саюзу. Гэта цяга ўзмацнялася ў працягу апошніх год як адказ на лютую эксплёатацыю і прыгнечаньні працоўных Польшчы польскім фашызмам.

Вітаючы прадстаўнікоў рабочых і сялян Польшчы ў чырвонай Маскве, сталіцы сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, мы павінны падкрэсьліць, што пралетарыят СССР і Польшчы злучаюць сувязь шматгадовай супольнай барацьбы. У царскія часы лепшыя прадстаўнікі польскага пралетарыяту поруч з пралетарыямі ўсіх нацыянальнасьцяй былой царскай імпэрыі пакутвалі на катарзе, у Сібіры. У час Кастрычнікавай рэвалюцыі польскія пралетары біліся на барыкадах і на ўсіх франтох супроць контррэвалюцыі, у тым ліку і польскай. І зараз яны прымаюць разам з пралетарыятам усіх нацыянальнасьцяй СССР удзел у вялізным сацыялістычным будаўніцтве. Нам асабліва дорага маніфэстацыя братэрскіх пачуцьцяў з боку пралетарыяту Польшчы ў той момант, калі польскія фашысты ўзмоцнена рыхтуюцца да новай вайны супроць СССР.

Ужо не адзін раз рабочыя і сяляне Польшчы жадалі паслаць да нас дэлегацыі. У 10-ю гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі да нас прыяжджала дэлегацыя ў колькасьці 10 чалавек. Зараз большасьць іх ужо пасаджаны ў турмы фашысцкай Польшчы. Старшыня гэтай дэлегацыі дэпутат Бачынскі засуджан на пяць год катаргі, між іншым, за тое, што ён перадаў ордэн Чырвонага Сьцягу тав. Ланцуцкаму. Пасьля лодзінскай забастоўкі была абрана другая дэлегацыя ў СССР, прычым на гэтай глебе разгарнулася шырокая кампанія сярод рабочых і сялян Польшчы пад лёзунгам абароны Савецкага Саюзу. Гэта дэлегацыя, абраная ў канцы 1928 году, не магла прыбыць у СССР з прычыны адмаўленьня ў выдачы ёй пашпартоў урадам Польшчы.

Цяперашняя дэлегацыя абрана ў адказ на фашысцкі зьезд зарубежных палякаў, які адбыўся нядаўна ў Варшаве і мэтаю якога зьяўлялася падрыхтоўка працоўных мас Польшчы і працоўнай польскай эміграцыі да новай вайны супроць СССР. Яна зьяўляецца адказам на недапушчэньне на гэты зьезд дэлегацыі працоўных палякаў СССР і на ваенную палітыку польскага фашызму, накіраваную супроць СССР.

Прыезд дэлегацыі рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ў СССР адбіває абвастрэньне клясавых супярэчнасьцяй у Польшчы. Шалёны тэрор фашысцкай дыктатуры ня зможа затрымаць узрастаючай рэвалюцыйнай хвалі. Дэманстрацыі 1 мая і 1 жніўня, шэраг буйных стачак, узрастаючы рэвалюцыйны рух у горадзе і вёсцы сьведчаць, што мы знаходзімся напярэдадні рашучых рэвалюцыйных боек. У гэты момант працоўныя масы Польшчы зварочваюцца да пралетарыяту і працоўных СССР.

Прыезд дэлегацыі, якая, ня гледзячы на ўсе прасьледваньні і перашкоды, прабралася ў межы СССР, лепш усяго гаворыць аб глыбокіх пачуцьцях міжнароднай клясавай салідарнасьці працоўных Польшчы. Пасылаючы сваіх прадстаўнікоў у СССР, яны прабіваюць сьцяну маны і паклёпу, якою польскі фашызм спрабуе адмежаваць працоўных Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад працоўных СССР. Прыезд дэлегацыі рабочых і сялян з краіны, якая зьяўляецца пляцдармам для нападу міжнароднага імпэрыялізму на СССР, гаворыць аб тым, што працоўныя масы Польшчы гатовы бараніць бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету—Савецкі Саюз.

Злучаючы нашы рукі ў братэрскім сьцісканьні, мы горача вітаем на вольнай савецкай зямлі прадстаўнікоў рабочых і сялян фашысцкай Польшчы, якія змагаюцца ў надзвычайна цяжкіх ўмовах за справу перамогі сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі. Мы ім пакажам усе нашы дасягненьні, усё наша вялізарнае сацыялістычнае будаўніцтва. Працоўныя СССР раскажуць ім усю праўду аб сваім становішчы. Дэлегаты польскіх рабочых і сялян і прыгнечаных польскім фашызмам працоўных украінцаў, беларусаў, яўрэяў, немцаў і г. д. змогуць уласнымі вачыма пераканацца ў тых вялізных перамогах, якія атрымалі працоўныя СССР, у тым ліку і палякі, дзякуючы Кастрычнікавай рэвалюцыі. Мы глыбока ўпэўнены, што дэлегаты, ня гледзячы на дзікія прасьледваньні з боку польскага фашызму, змогуць, вярнуўшыся назад у фашысцкую Польшчу, расказаць усю праўду аб СССР.

Пралетарыят і працоўнае сялянства СССР, вітаючы ў асобе дэлегатаў рабочую клясу і працоўнае сялянства Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, упэўнены, што яны рашуча выступяць супроць новай вайны, якую падрыхтоўваюць польскія фашысты супроць Савецкага Саюзу.

Няхай час пабыту дэлегацыі рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ў СССР стане маніфэстацыяй міжнароднай салідарнасьці ўсіх працоўных у барацьбе за перамогу сусьветнай рэспублікі саветаў.

„Правда".

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Новы антысавецкі выпад польскай улады

ВАРШАВА, 8-VIII. У „Савецкай Беларусі" ўжо паведамлялася аб адчыненьні ў Варшаве міжнароднага кангрэсу інвалідаў вайны, прычым падкрэсьлівалася, што зьезд праходзіць пад апекаю вайсковага міністэрства.

На зьезьдзе інвалідаў, як паведамляе „Глос Правды", прынялі ўдзел інваліды-пятлюраўцы. Пятлюраўцы ўнесьлі рэзалюцыю, у якой гаворыцца аб „гвалтоўнай акупацыі савецкім войскам Украіны і Каўказу" і падкрэсьліваецца, што „без вызваленьня гэтых краін з-пад савецкага ярма нацыфікацыя ўсходняй Эўропы зьяўляецца немагчымай".

Камісія кангрэсу інвалідаў, „узяўшы пад увагу ўкраінскую прапанову", прыняла рэзалюцыю, у якой выказвае спачуваньне акупаваным Украіне і Грузіі і дае завярэньні адносна сваіх сымпатый да народаў, «якія знаходзяцца пад савецкім ярмом». Рэзалюцыя заклікае ўсе інвалідныя арганізацыі, „дзейнічаючы ў духу ідэалаў Лігі Нацый", зьвярнуць увагу грамадзкае думкі сваіх краін на цяжкае становішча Украіны і Каўказу пад акупацыяй Саветаў. Рэзалюцыя камісіі ўхвалена і пленумам кангрэсу.

Гэты трук, аранжыраваны насьпех у Варшаве, зьяўляецца, бясспрэчна, спробаю затушаваць уражаньне дню 1 жніўня. Характэрна, што вайсковыя колы, якія складалі рэзалюцыю, гавораць у ёй чыста сацыял-дэмакратычным спосабам аб „вышэйшых ідэалах Лігі Нацый". Па форме і па зьместу рэзалюцыя зьяўляецца толькі простым дадаткам да рэзалюцыі II-га Інтэрнацыяналу аб савецка-кітайскім канфлікце.

Напярэдадні ўсеагульнай забастоўкі.

ВАРШАВА, 9-8. Забастоўка мэталёўцаў ня спыняецца. Прафсаюзы рабочых іншых галін прамысловасьці заклікаюць да ўсеагульнай забастоўкі, каб падтрымаць мэталёўцаў. На належачых францускай кампаніі прадпрыёмствах Верхняй Сілезіі абвясьцілі забастоўку, якая ахапіла некалькі тысяч рабочых. На мэталёпрамысловых прадпрыёмствах Варшавы насьпіраецца канфлікт, які можа выліцца ў забастоўку.

„Дапамога" галадуючым.

ВАРШАВА, 9-8. У Заходняй Беларусі паліцыя ліквідавала камітэты беднаты, арганізаваныя для аказаньня дапамогі галадуючаму насельніцтву. Праведзены шматлікія арышты.

На вышэйшую ступень.

Польская гаспадарка даведзеная палітыкай фашызму да крызісу, увесь цяжар якога ўзвален на плечы працоўных, няўхільна ідзе да катастрофы. Рабочая кляса больш ня можа зьнесьці жабрацкага становішча, сыстэматычнага недаяданьня, і рашуча выступае на барацьбу з фашысцкай дыктатурай. Суровы тэрор, масавыя аблавы, арышты авангарду пралетарыяту—камуністаў і сьвядомых рабочых, здрадніцкая палітыка ППС, якая ціхачом садзіць нож у сьпіну рабочай клясы, ня могуць стрымаць рэвалюцыйнай хвалі, якая ўскалыхнула ўсю Польшчу.

Сёньня тэлеграф прынёс весткі, што мэталёўцы Верхняй Сілезіі абвясьцілі забастоўку, якая ахапіла некалькі тысяч рабочых. На мэталёпрамысловых прадпрыёмствах Варшавы насьпіраецца канфлікт, які можа выліцца ў забастоўку.

Пад моцным націскам рабочых мас прафсаюзы іншых прадпрыёмстваў агаласілі адозву, у якой заклікаюць рабочых да ўсеагульнай забастоўкі, каб падтрымаць бастуючых таварышоў мэталёўцаў.

Вялікая напружанасьць у шэрагах рабочай клясы, клясавая салідарнасьць, цьвёрдасьць, рашучасьць з якой пралетарыят выступае, яскрава пастаўленыя палітычныя патрабаваньні бастуючых—усё гэта сьведчыць аб пераходзе клясавай барацьбы польскага пралетарыяту на вышэйшую ступень, гэта паказвае, што супярэчнасьці клясаў эксплёататараў і эксплёатуемых даходзяць да крытычнага моманту, што казялкі, на якіх трымаецца польскі фашызм вельмі падгнілі і гатовы рухнуць пад магутным націскам рэвалюцыйных працоўных мас.

Л. Г.

НА ГААГСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

Закулісны, але пераважны ўплыў Амэрыкі.

ГААГА, 8-8. Злучаныя Штаты прадстаўлены ў Гаазе сьціплым наглядачом у асобе сэкратара пасольства Паўн.-Амэрык-Злучан. Штатаў Вільсона, які лічыцца знаўцаю рэпарацыйнага пытаньня. Тым ня менш уплыў іх адчуваецца на кожным кроку. Злучаныя Штаты ня толькі абапіраюцца на вялікую колькасьць фінансавых і прамысловых экспэртаў, а таксама на ўплывовых прадстаўнікоў дзелавога сьвету, якіх вельмі шмат ва ўсіх дэлегацыях, але ня спыняюцца таксама і перад простым умешваньнем у пэрамовы. Так, на ўчарашнай нарадзе амэрыканскі наглядач заявіў, што ён пакідае за сабой права выказаць у фінансавай камісіі амэрыканскі пункт гледжаньня ў пытаньні аб ануітэтах (гадавых пляцяжох). Водлуг вестак добра дасьведчаных колаў, Вільсон выступіць супроць патрабаваньня Англіі аб дачы ёй часткі з так званых бязумоўных рэпарацыйных плацяжоў.

Пры ўсім тым амэрыканскі наглядач удзельнічае толькі ў фінансавай камісіі. У палітычнай камісіі ён ўдзел ня прымае. Тым самы Злучаныя Штаты дэманструюць, што яны не зацікаўлены ў пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскай вобласьці, а цікавіцца выключна ажыцьцяўленем пляну Юнга і праэктам устанаўленьня банку міжнародных разьлікаў.

Згодна па пытаньні аб месцазнаходжаньні і паўнамоцтвах банку міжнародных разьлікаў можа аказацца вельмі цяжкай. З прыватных заяў некаторых членаў ангельскай дэлегацыі відаць, што дзелавыя колы Лёндану ўстурбаваны ідэяй дачы банку права кантролю над усім залатым зваротам і права распараджацца дзьвюма пятымі ўсяго залатога пакрыцьця. На думцы гэтых колаў, рэпарацыйны банк павінен выконваць толькі функцыі разьліковага банку для рэпарацыйных плацяжоў. Наадварот, у амэрыканскіх колах заўважаюць, што фінансавыя інстытуты П-А Злучаных Штатаў, страцяць інтарэс да рэпарацыйнага банку, калі яго дзейнасьць будзе так звужана.

Фінансавыя колы Галяндыі і іх друк адкрыта згаджаюцца з баязьню ангельцаў, каб амэрыканцы пры дапамозе рэпарацыйнага банку не замацавалі сваёй фінансавай перавагі. Гэтыя пытаньні і будуць стаць у цэнтры нарад, якія будуць адбывацца ў Гаазе.

Сноўдэна выхваляюць.

ЛЁНДАН, 9-8. Як кансэрватыўны, так і лібэральны ангельскі друк аднадушна адабрае пазыцыю занятую Сноўдэнам на Гаагскай канфэрэнцыі. „Дэйлі Кронікль" піша: „Нельга ўявіць саба нічога лепшага, чымся тыя заявы, якія Сноўдэн зрабіў у Гаазе але Сноўдэн ня толькі зрабіў заявы; ён павінен зрабіць болей, ён павінен дабіцца перамогі ангелькага пункту гледжаньня.

„Камісіі і падкамісіі".

ГААГА, 9-VIII. На пасяджэньні палітычнай камісіі гаагскай канфэрэнцыі Гендэрсэн прапанаваў каб у праграму работ камісіі ўвайшлі два пытаньні. Першае—аб спыненьні акупацыі Рэйнскае вобласьці і другое—аб згаджальнай камісіі ў Рэйнскай вобласьці.

Камісія пастанавіла стварыць падкамісію для абмеркаваньня тэхнічных пытаньняў зьвязаных з абмежаваньнем акупацыі, а таксама перавод і перадача нямецкай уладзе ўсёй тэрыторыі занятай цяпер акупацыйным войскам. У падкамісіі будуць мабыць прымаць удзел і прадстаўнікі Нямеччыны і акупуючых дзяржаў Францыі, Бэльгіі, Англіі.

РАСПРАВА РУМЫНСКІХ ПАЛАЧОУ

Пахаваньне забітых рабочых.

Узмацняецца рэвалюцыйны камуністычны дух у шэрагах гарнякоў.

ВЕНА, 9-8. Як паведамляюць з Румыніі. Учора ў Жылаве адбылося пахаваньне забітых рабочых. На пахаваньне былі дапушчаны толькі бліжэйшыя сваякі забітых. З ліку параненых рабочых яшчэ адзін памёр у больніцы, адзін знойдзен за 40 кілёмэтраў ад месца расстрэлу. Ня спыняецца канцэнтрацыя войска ў важнейшых пунктах лагчыны Жылавы.

Газэта „Друг" вэнгерскай меншасьці Румыніі, абгаварваючы падзеі ў Жылаве падкрэсьлівае страшэннае ўбозтва гарнякоў. Лібэральны друк абвінавачвае ўрад у тым, што ён шляхам рэпрэсій узмацняе рэвалюцыйна-камуністычны рух сярод гарнякоў.

Орган ахранкі „Унівэрсул" піша аб махінацыях вэнгерскіх нацыяналістаў абвінавачваючы іх у падбухторваньні рабочых. Афіцыёзная «Страндэску» заяўляе, што ўрад ня можа быць адказным за падзеі і ўбоства рабочых, бо гэта немагчыма ліквідаваць у кароткі час.

Тэрорам не зламалі.

ВЕНА, 9-8. Водлуг паведамленьня з Бухарэсту спробы румынскай улады ліквідаваць забастоўку тэрорам не даюць ніякіх вынікаў, бо рабочыя трымаюцца цьвёрда і заяўляюць „што маюць намер працягваць барацьбу да канца". Прымаючы пад увагу, што забастоўка ахапіла таксама рабочых па тэхніцы безапаснасьці, дык ёсьць небясьпека, што на шахтах можа здарыцца абвал. З гэтай прычыны ўрад аддаў жандармэрыі загад «найбольш энэргічнымі мерамі забясьпечыць работы па тэхніцы безапаснасьці, таксама на электрычнай станцыі і вадаправодзе.

Нанкінскі ўрад просіць „абароны"

Нанкінскі ўрад зьвярнуўся да „вялікіх" дзяржаў

ТОКІЁ, 7-8. (Затрымана дастаўкаю). «Ніцы—Ніцы» і «Токіё Асахі» паведамляюць з Нанкіну, што прычыны неспадзеванай цьвёрдай пазыцыі савецкага ўраду, нанкінскі ўрад зьвярнуўся да ўсіх дзяржаў, прымаючых удзел у пакце Белёга з заявай, у якой сьцьвярджае, што няўдача савецка-кітайскіх перамоў аб УК чыгунцы тлумачыцца неабгрунтаванымі патрабаваньнямі СССР аб аднаўленьні савецкага прадстаўніка і віцэ-старшыні УК чыгункі.

Увесь друк зьмяшчае паведамленьне з Харбіну аб тым, што пачнуцца перамовы ня толькі па пытаньні аб УК чыгунцы, але і па пытаньні аб падпісаньні савецка-кітайскага гандлёвага дагавору, а таксама аб аднаўленьні савецка-кітайскіх дыпляматычных адносін.

Агенцтва Сін-Бун-Рэнга паведамляе са станцыі Манчжурыі, што Чу-Сао-Ян спрабуе аднавіць сувязь з Мельнікавым і ў выпадку, калі гэта посьпехам, паедзе ў Маскву.

Абвостранае становішча на УК чыгунцы.

ТОКІЁ, 7-VIII. (Затрымана дастаўкаю). Водлуг паведамленьня з Сарбіна няўдалыя вынікі перамоў паміж Кітаем і Мельнікавым надзвычайна абвастрылі становішча на УК чыгунцы. Сярод савецкіх грамадзян і рабочых назіраецца моцны ўздым. Савецкія грамадзяне, якія застаюцца на службе ў УК чыгунцы, заяўляюць аб немагчымасьці нармальнай работы пры сучасных абставінах.

Прадстаўнікі нямецкага консульства наведалі ў турме 39 савецкіх грамадзян, арыштаваных у зьвязку з наскокам на консульства. 90 савецкіх грамадзян, арыштаваных у іх памяшканьнях 3 жніўня, да гэтага часу ня вызвалены. Звальненьне савецкіх грамадзян з розных устаноў ня спыняецца. Адміністрацыя УК чыгункі перадала кітайскай уладзе некаторыя ўстановы.

На фронце клясавай барацьбы.

Лёкаут трывае.

ЛЁНДАН, 9-8. За кулісамі вельмі стараюцца, каб наладзіць перамовы паміж тэкстыльнымі фабрыкантамі і прафсаюзамі. Лічыцца магчымым, што прадстаўнікі ткачоў сустрэнуцца з прадпрыёмцамі ў бліжэйшыя дні. Падкамісія генэральнай рады ў складзе Келеса, Саэльса і Хікса прыбыла сёньня ў Манчэстэр, каб азнаёміцца са становішчам і прапанаваць сваё пасрэдніцтва, калі гэта будзе неабходным.

Члены палаты вобшчын ад Ленкашыру найстойліва раілі Макдональду зрабіць новую спробу схіліць бакі да перамоў. Адначасова фабрыканты публікуюць заявы тон якіх нельга назваць лагодным. Напрыклад, старшыня фэдэрацыі, уласьнік ткацкіх фабрык Халройд заявіў, што згода можа быць дасягнута толькі на аснове «значнага скарачэньня заработку».

Бастуе 210 тысяч.

ЛЁНДАН, 9-8. Водлуг паведамленьня з Калькуты забастоўка рабочых джутавых фабрык пашыраецца і ахапляе ўжо 210000 чал. Кіраўнікам прафсаюзаў джутавікоў уезд у райён забастоўкі забаронен, у зьвязку з крывавою сутычкаю, якая мела месца ў Каункоры, 7 жніўня праведзены дадатковыя арышты.

Сёньня, згодна прапановы нацыялістаў, заканадаўчы збор у Бэнгаліі будзе абгаварваць створанае ў райёне забастоўкі становішча.

Забастоўка на сталялітнях

ВЕНА, 9-8. Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, на буйнейшых румынскіх сталялітных заводах абвешчана забастоўка. Прычына забастоўкі—адмаўленьне адміністрацыі здавольніць патрабаваньні рабочых аб павялічэньні заработку.

Працоўныя Кіеву запрашаюць у госьці

КІЕЎ, 9-8. Паведамленьне аб прыезьдзе працоўных Польшчы выклікала вялікую цікавасьць працоўных палякаў Кіеву. Польская газэта „Серп" зьвярнулася да дэлегацыі з прывітаньнем і запрашэньнем наведаць Украіну, у прыватнасьці польскі Мархлёўскі райён на Валыні.

ПОЛЬШЧА ЧАПЛЯЕЦЦА

КОЎНА, 9-8. Паводле паведамленьня літоўскага тэлеграфнага агенцтва польская ўлада 9 жніўня па невядомых матывах забараніла зносіны праз польска літоўскую дэмаркацыйную лінію ў раёне Уцэх-Олікі. Літоўскія жыхары, праз зямельныя вучасткі якіх праходзіць у гэтым раёне дэмаркацыйная лінія, церпяць вялікія страты, бо палявыя работы былі ў поўным разгары.

Прэм'ер Вальдэмарас паслаў тэлеграму генэральнаму сэкратару Лігі Нацый Друмонду зазначаючы на парушэньне Польшчаю ратыфікаванай Кёнігзбэргскай згоды аб мясцовых зносінах у раёне дэмаркацыйнае лініі.

Палёт вакол сьвету.

НЬЮ-ЁРК, 9-8. Сёньня а паўночы нямецкі цэпэлін пачаў палёт вакол сьвету, узяўшы курс на паўночны ўсход ад Ньюфаундлэндзкіх выспаў. Заўважан дырыжабль у 900 мілях на ўсход ад Нью-Ёрку. Дырыжабль накіроўваецца спачатку ў Фрыдгафэн, а адтуль на Ўсход праз Эўрапейскую частку СССР, Сібір і Японію зноў у Амэрыку.

Усебеларускі зьлёт піанэраў

МІТЫНГ НА ПЛЯЦУ ВОЛІ

Мітынг Усебеларускага зьлёту піанэраў адчыняе старшыня ЦБЮП т. Буклей.

З вялікаю прамовай прывітаньня ад імя ўраду выступіў старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў.

Ён, між іншым, сказаў:—Сёньня камуністычная партыя, камсамол і ўся савецкая грамадзкасьць сьвяткуюць сьвята Ўсебеларускага піанэрскага зьлёту.

Калі наша маладое узрастаючае пакаленьне,—нашы дзеці—будуць падрыхтаваны, каб выконваць працу сваіх бацькоў—пабудову ў нашай краіне камунізму—мы будзем упэўнены, што пераможам. У барацьбе за калектывізацыю за індустрыялізацыю нашай краіны мы павінны шырока ставіць перад сабою задачы выхаваньня нашых дзяцей.

Нашы ворагі разумеюць значэньне выхаваньня дзяцей,—а дзеля гэтага стараюцца ўсялякімі спосабамі ўплываць на нашых дзяцей.

Нашы ворагі па-замежамі стараюцца выхоўваць дзяцей, каб яны служылі іх мэтам і заданьням. Буржуазея выхоўвае сабе паслухмяных нявольнікаў, зацямняючы іх клясавую сьвядомасьць.

Ведаючы ўсё гэта мы не павінны забываць аб піанэрах, аб нашых да іх абавязках.

Піанэрская праца ў апошні час шырока разгарнулася пад кіраўніцтвам нашае партыі і камсамолу, каб выхаваць нашу зьмену ў духу камунізму. Мы маем вялікія дасягненьні, мы дасягнулі вялікіх уплываў на дзяцей працоўных усяе Беларусі.

На зьлёце мы павінны праверыць усе нашы дасягненьні ў галіне камуністычнага выхаваньня дзяцей, падлічыць усе хібы гэтага выхаваньня. А хібы мы маем, бо поруч з арганізаванымі дзяцьмі ў піанэрскіх атрадах мы бачым тут многа неарганізаваных дзяцей, якія патрабуюць нашае дапамогі.

Трэба, каб зьлёт паказаў, што гэта задача, задача выхаваньня нашых дзяцей ня толькі зьяўляецца задачаю партыі і камсамолу, але павінна быць задачаю і самай грамадзкасьці.

Савецкі ўрад у сваей дзейнасьці стараўся дапамагаць камсамолу ў яго працы па піанэр-руху. Савецкі ўрад на сваім паседжаньні, прысьвечаным піанэрзьлёту, пастанавіў зьвярнуць увагу ўсіх цэнтральных савецкіх устаноў, каб яны дапамагалі камуністычнаму выхаваньню нашых дзяцей. Савецкі ўрад распрацаваў шэраг мерапрыёмстваў, каб піанэрскія арганізацыі ахапілі ўсіх дзяцей працоўных.

Я, у вашай асобе, перадаю прывітаньне ўсёй піанэрыі Беларусі і спадзяюся, што вашы шэрагі павялічацца.

Для барацьбы і працы для камунізму—піанэры будзьце гатовы!!!

На трыбуне прадстаўнік Віцебскай піанэрарганізацыі т. Лукашэвіч у гарачых натхнёных дзіцячых словах перадае зьлёту прывітаньне і гаворыць, што піанэры гор. Віцебску прымаў актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве.

Пасьля гэтага з рапартам аб сваёй працы ад імя 8 тысяч піанэраў Меншчыны выступіў прадстаўнік Менскай арганізацыі, які ахарактэразаваў усю працу піанэраў за апошні час.

ЗЬЛЁТ ПАЧАЎСЯ.

Горад ператварыўся. Горад прыняў сьвяточны выгляд...

На дамох чырвоныя штандары, лёзунгі—прывітаньні ў гонар гасьцей—унучат Ільліча.

Сёньня выйшлі на вуліцу дэманстраваць сваю моц дзеці.

Ідуць сотні, тысячы... Мільгацяць чырвоныя гальштукі, барабанная дроб, звонкія дзіцячыя песьні...

У калёнах разам з дзяцьмі, дэманструюць два старшых пакаленьні—бацькі—рабочыя і камсамольцы.

А з згуртаваных калён маладых ленінцаў вызначаюцца запатрабаваньні:

— Больш увагі справе выхаваньня дзяцей;

— Мабілізуем увагу грамадзкіх арганізацый да ўсебеларускага зьлёту!

— Усе дзеці працоўных у шэрагі юных піанэраў!

На Пляцу Волі выстраіліся роўныя шэрагі маладых бальшавіцкіх арлянят. Каманда.

Парад усебеларускага зьлёту прымаюць т. т. Гамарнік, Чарвякоў, Аверын, Рывін і інш.

На трыбуне ўсебеларускі стараста:

— Юныя ленінцы павінны аўладаць традыцыямі сваёй клясы, вучыцца змагацца і працаваць у старой гвардыі бальшавікоў, павінны кожны крок жыцьця зьвязаць з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва краіны...

Адзінае, бадзёрае—

— Заўжды гатоў!—

аддаецца моцным эхам на ўсіх куткох пляцу на заклік т. Чарвякова быць падрыхтаванымі да будучых боек і гартаваць з сябе байцоў сусьветнага Кастрычніка.

Віцебская і менская дэлегацыі тутжа рапартуюць лічбамі і фактамі аб праробленай працы.

Парад скончан. Ідуць доўгія стройныя шэрагі дзяцей.

І ў магутнай хвалі дэманстрацыі адчуваўся магутны рытм будаваньня будучага камуністычнага ладу.

Дзеці—нашае будучае!..

М.

Падпіска на III пазыку індустрыялізацыі

Папярэдняя падпіска ў Менску дасягнула 1.500.000 р.

Нашаму супрацоўніку паведамілі ў Наркамфіне, што на ўчарашні дзень папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі па гораду Менску дасягнула ўжо 1.500.000 руб.

Атрыманы весткі з Гомелю, што там толькі па гораду падпіска на пазыку дасягнула 750.000 руб., а на Магілеўскай акрузе—260.000 р.

КРЫХУ АДСТАЛІ.

Рабочыя менскага кафэльнага заводу ўжо афармілі падпіску на новую пазыку індустрыялізацыі. З агульнай колькасьці 48 рабочых на пазыку падпісаліся 45 чалавек на 2800 руб., што складае менш 100 проц. месячнага заработку.

ПАДПІСКА ПРАЙШЛА З ПОСЬПЕХАМ.

Рабочыя менскай футравай фабрыкі паставілі перад сабой задачу даць 100 пр.. месячнага заработку ў пазыку дзяржаве Задача выканана—рабочыя фабрыкі падпісаліся на 12070 руб. Рабочыя кажуць,—гэта наш адказ на проісхі сусьветнай буржуазеі.

ТЫРАЖЫ ПАЗЫКІ Ў БССР.

Тыраж выйгрышаў па пазыцы ўзмацненьня сельскай гаспадаркі па 48 і 11 сэрыям адбудзецца ў Вэтрыне Полацкай акругі ў верасьні месяцы.

У лістападзе месяцы ў Віцебску адбудзецца 9 тыраж выйгрышаў на 1 пазыцы індустрыялізацыі.

ПРАЦАЎНІКІ ПРАФШКОЛЫ ДАЛІ 4000 РУБ.

Калектыў працаўнікоў Менскай аб'яднанай прафтэхнічнай школы ў адказ на наглыя выпады міжнароднага капіталу праз кітайскіх фашыстаў сабраў падпіску на 3 пазыку індустрыялізацыі на 4000 руб

БЕЛ. АКАДЭМІЯ НАВУК—14000 Р.

Навуковыя працаўнікі і ўвесь калектыў Беларускай Акадэміі Навук за адзін дзень сабралі падпіскі на новую пазыку індустрыялізацыі на 14000 руб. Падпіска дасьць большую суму пасьля сканчэньня водпускнай кампаніі.

ДАЛІ 100 ПРОЦ. ЗАРПЛАТЫ Ў ПАЗЫКУ ДЗЯРЖАВЕ.

Калектыў рабочых пратэзнай майстэрні горача адгукнуўся на заклік прыняць удзел у рэалізацыі 3 пазыкі індустрыялізацыі і пастанавіў падпісацца на пазыку на 100 пр. месячнага заработку. Слова рабочых не адстала ад справы. падпіска ўжо аформлена на 2315 руб., што складае 100 проц., месячнага заработку.

СУМУ ПАДПІСКІ ПАДВОІМ.

У працкалектыве шчотачнікаў працуе звыш 600 рабочых, а на 3 пазыку індустрыялізацыі падпісалася толькі 298 чал. Частка рабочых знаходзіцца ў водпуску і рэалізацыя пазыкі сярод гэтых рабочых будзе праведзена пасьля сканчэньня водпускнай кампаніі. Усё-ж падпіска ў працкалектыве дала 15915 руб. Бязумоўна, гэтае сума з часам будзе падвоена.

ПАДПІСКА Ў „БЕЛКУСТПРОМСАЮЗЕ".

Працаўнікі „Белкустпромсаюзу" ў колькасьці 67 чалавек падпісаліся на 3 пазыку індустрыялізацыі на 8005 р. Усяго ў калектыве налічваецца 92 працаўнікі, якія атрымліваюць у месяц зарплату ў суме 10488 руб. Па сканчэньні водпускной кампаніі мяркуюць суму падпіскі павялічыць.

МЭДЫЦЫНСКІЯ ПРАЦАЎНІКІ РАЗАМ З РАБОЧЫМІ.

Так сказалі на сваім сходзе працаўнікі Сухотнага Інстытуту і разгарнулі падпіску на 3 пазыку індустрыялізацыі 52 чалавекі падпісаліся на 2495 руб. Падпіска працягваецца.

ГРУЗЧЫКІ ДАЛІ ПАДПІСКІ НА 3825 РУБ.

Гарадзкі групком грузчыкаў сярод рабочых разгарнуў падпіску на пазыку. Падпіска прайшла з посьпехам, бо ўсе шэраг выпадкаў, калі падпіваліся на 150-200 проц. месячнага заработку.

Сярод 33 рабочых грузчыкаў сабрана падпіскі на 3825 руб. І яна ўжо афармлена.

На Індустрыялізацыю.

6 жніўня на курсах па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы пры Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школе адбыўся агульны сход курсантаў і выкладчыкаў.

Пасьля каротнага дакладу аб дні індустрыялізацыі, курсанты, аднагалосна пастанавілі, чым толькі можна дапамагчы індустрыялізацыі.

Уже 7 жніўня партыя курсантаў у 30 чалавек накіравалася на ўвесь дзень грузіць дошкі на чыгуначную станцыю МББ. у нядзелю 10-8 усе курсанты арганізоўваюць нядзельнік, увесь заработак з якога ахвяраван дню індустрыялізацыі.

Каб сабраць пэўную суму грошай сярод курсантаў і выкладчыкаў, выпускаюцца падпісныя лісты.

Так будучыя чырвоныя камандзіры б'юць ворага не толькі на вясьнным, але і на гаспадарчым фронце.

Г. В.

Заданьне выканаюць поўна.

Магілеў. Настрой рабочых і служачых да новай пазыкі індустрыялізацыі вельмі прыхільны. Падпіска праходзіць з вялікім посьпехам. У шэрагу ўстаноў падпіска перавысіла месячны заработак. Нагул, кантрольная лічба па гораду будзе поўнасьцю пакрыта.

ПАДПІСАЛІСЯ НА 200 ПРОЦ.

Рабочыя грузчыкі МББ чыгункі не жадаюць адставаць ад усіх працоўных і за адзін дзень сабралі падпіскі на пазыку індустрыялізацыі на 8325 руб. Ніхто зараз не падпісаўся менш, чым на месячны заработак а шэраг рабочых падпісаліся на ват на 100 проц. заработку.

ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ НЕ АДСТАЮЦЬ.

Чырвонаармейцы № канвойнага палка на наглы наёт кітайскай ваеншчыны на Ўсходня-Кітайскую чыгунку адказалі дружнай падпіскай на 3 пазыку індустрыялізацыі. Пакуль што падпіска дала 1000 руб.

* * *

Супрацоўнікі апарату ГЭТ ў ліку 65 чалавек падпісаліся на 3 пазыку на агульную суму 7485 р. (110 процантаў заработку).

* * *

Супрацоўнікі апарату аграстраху і Дзярж страху, у ліку 72 асоб падпісаліся на 3 пазыку на суму 8025 р.

Падпіска прадаўжаецца.

* * *

Супрацоўнікі апарату Белдзяржгандлю і яго менскага аддзяленьня, у ліку 100 асоб падпісаліся на 3

У дапамогу чыстцы партыі і савецкага апарату.

Растратчыкам ня месца ў партыі.

У Чачэвіцкім р-не ёсьць Надсельскі с.-с., у якім загадчыкам хаты-чытальні працаваў Іваноў (ён-жа сакратар партячэйкі), а ў другой установе—КСТУ—працаваў Пудаў. Жылі хлопцы, ніяк хлопатаў ня ведалі, грошай у КСТУ хапала: сабралі сяброўскіх адлікаў 300 рублёў, прадалі лес мясцовага значэньня ў 10 дзесяцін, прычым грошы за прадажу лесу прыходавалі ў свае кішэні.

Жылося хлопцам на «яць». Самі сабе былі маленькімі царкамі ў вёсцы Надсёлах, самі пастанаўлялі, рэвізавалі, кралі і г. д. У выніку такога «гаспадараньня» сталі прыкмячаць, што грошай не хапае па тых рахунках, якія вяліся ў КСТУ, стала пахнуць растратай дзяржаўных грошай. Але хлопцы з галовамі—дагадаліся. У адну прыгожую раніцу Іваноў і Пудаў пакінулі Надсельскі с.-с. і выехалі ў Сібір, кінуўшы ўсе справы ячэйкі і КСТУ бяз усякай справаздачнасьці.

Мясцовае начальства ў асобе сельсавету палічыла гэты ад'езд фармальным, падлічыла што не хапае 300 рублёў з лішнім і на гэтым супакоілася.

Калі сялянства стала патрабаваць справаздачнасьці і расьсьледаваньня гэтай справы, то старшыня с.-с. сказаў, „што іх прывядуць к нам пад вартай і грошы будуць цэлы».

Але ўся справа патухла, партячэйка таксама хладнакроўна аднеслася да гэтай авантуры, толькі сялянства часам кідае кепскія словы па адрасу с.-с. і „ўцекачоў".

РСІ, дапамажы вывесьці растратчыкаў на чыстую ваду, бо мясцовыя арганізацыі,--як райком КП(б)Б, ня лічуць гэту растрату крымінальшчынай, замялі яе і не даюць належнага рэагаваньня на гэты факт, заслугоўваючы грамадзкага абвінавачаньня.

Кр.

Чачавіцкі р-н, Магіл. акр.

Зеляноцкая парт'ячэйка перачышчана.

Ячэйка ня вывучыла эканамічнага становішча сельсавету, дыфэрэнцыацыі вёскі; слабы ўдзел прымала ў калектывізацыі і слаба кіравала гаспадарчай часткай сельсавету.

Надзвычайна слабое было кіраўніцтва камсамолам, з прычыны чаго некаторыя камсамольскія ячэйкі не расьлі і склад іх быў серадняцка-кулацкі (Зеляноцкая ячэйка ЛКСМ).

Ячэйка, не рэагавала на хваробныя зьявішчы асобных партыйцаў, як на п'янства, склочніцтва, антысэмітызм і шавінізм і цэлы шэраг іншага.

Праверка выявіла палітняпісьменнасьць некаторых партыйцаў, а адсюль і слабасьця партвучобы, як гурткавай, так самаадукацыйнай. Да прыкладу некаторыя партыйцы «волыканком» называлі заўкомам.

Слаба праводзілася праца сярод беднаты і батрацтва. Сходы беднаты праводзіліся кампанейска і з гэтай прычыны бедната ня была зацікаўлена працай ячэйкі.

Адсутнічала кіраўніцтва ячэйкі насьценгазэтамі.

Характэрнымі кандыдатамі для чысткі былі: 1) Леўчанка-рабочы ст. Гарочыцы, антэсэміт, склочнік, п'яніца, бузацёр—выключан з партыі.

2) Зіновіч Аўрам—селянін вёскі Гарочыцы, працаваўшы калісь добра, але напаўшы пад уплыў свайго бацькі царкоўнага старасты і скаціўшыся з пралетарскіх рэяк.

3) Судзьбін Цімох—рабочы-чыгуначнік, п'яніца, не парваўшы з рэлігійнасьцю і прошлае якога сумленнае.

4, 5 і 6) Рэпіч, Цітова і Назаранка, сяляне, але зьяўляючыяся балластам у партыі і ніякай працы ня нёсшыя і нават не наведываўшыя сходаў.

З 18 чалавек вычышчана 6.

У часе праверкі тройка дастаткова застанаўлівалася на кожным таварышу, але асаблівую ўвагу заслужылі партыйцы Драздоў і Міронаў. Першы заўсёды працуе старшынёю калгасу «Савецкая Беларусь», любіцель уласнасьці, зрываў калгас і зараз пасе свае каровы ў сенажаці асобна ад калгаскіх. Правертройка выслухала выступаўшых таварышоў і зрабіла папярэджаньне Драздову. Міронаў — вытворчы міліцыянэр; акрамя працы на заводзе за год узяў каля 40 самагонных апаратаў. Многа нажыў ён ворагаў-самагоншчыкаў, грубаваты быў пры выкананьні службовых абавязкаў, але Міронава стаялі беднякі і лепшыя сераднякі, а таксама рабочыя. Правертройка вынесла Міронаву выгавар.

Праведзеная чыстка Зеляноцкай ячэйкі зрабіла добрае ўражаньне на беднату і лепшых сераднякоў. На чыстку прышлі сяляне за 17 вёрст.

Пасьля зачыненьня сходу сяляне зазначылі, што ячэйка цяпер добрая, калі ня лічыць Драздова, але і апошні павінен паправіцца, бо вушы яму нацёрлі добра.

К. Ю. Ю.

Парфума „каці" і гаркамгас.

Вусы дагледжаны цырульнікам, закручаны канчыкі ўгару, барада падрэзана пад «аля фасон» ножніцамі, і ад усяго гэтага нясе за поўвярсты парфумай «вышэйшай замежнай якасьці»—«каці»... Лякавыя камашы, бастон, шоўкавая рагожка на летняй кашулі і ўсё гэта на адным грамадзяніне Гарноўскім, з-за якога многія скардзяцца на Менскі гаркамгас і на некаторых з Менскага гарсавету.

Было-б за што скардзіцца і вінаваціць гэткую бяскрыўдную ўстанову, тады калі сапраўды было за што, а то... Да 1927 г., калі гэта асоба ў замежным абліччы працавала ў Менскім гаркамгасе ў якасьці інжынэра, тады, калі гэта асобе сваімі пальчыкамі перакідала штогод чатыры тысячы руб. чыстага непрацоўнага прыбытку ад трох сваіх вялізарнейшых будынкаў, калі ў гэтых будынках ніхто і ня ведаў пра 30 проц. норму і тады, калі асоба гэта на перавыбарах саветаў падымала руку ў шоўкавай „перчатке" разам з рукой менскага рабочага і аршанскага селяніна.

Тады вось ня скардзіліся на камгас, а было за што. Дамаўласьнік, тры будынкі ў сваім карыстаньні, у той час, калі куды горшыя муніцыпалізавалі. чалавек мае вялікія прыбыткі, а падаходныя спажывае сам, спажывае і... права голасу не пазбаўлены.

Пазбаўленьне права голасу, як нам вядома, па нашай канстытуцыі—справа гарсавету, а не камгасу, але што да гэтага суседзям, якія добра ведаюць былога інжынэра гаркамгасу—Гарноўскага.

Мы-ж пішам не таму, каб нападаць на бяскрыўдную ўстанову. На яе і так штодня нападаюць тысячы праз жылёвы стол, мы хочам толькі сказаць суседзям, што зараз Гарноўскага лёгка аблажыць падаходным, зараз у яго будынках лёгка забраць 30 проц. норму з жылплошчы і ўрэшце чалавека з тысячамі рублёў непрацоўнага прыбытку зусім лёгка пазбавіць права выбарчага голасу, а вось спрабавалі-б вы гэта зрабіць да 1927 г., тады мы паглядзелі...

Зараз гэта ня шутка, хоць праўда і сёньня асоба з вялізарнымі прыбыткамі, Гарноўскі ў парфуме, таксама раскашаецца і права голасу прадстаўлена яму, як кожнаму працаўніку Савецкага Саюзу... Ён і зараз у лякавых камашах гуляючы па вуліцах Менску, шукаючы „каці", знаходзіць сваіх старых знаёмых, сваё былое „начальства" з гаркамгасу, з якімі разам падымаў руку выбіраючы ў савет рабочых сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і мае права пакуль што падымаць і зараз.

Ул.

ЧЫСТКА АКРСТРАХУ СКОНЧАНА.

На працягу чатырох адкрытых пасяджэньняў камісія на чыстцы апарату Менскага Акрстраху была абгаворана работа ўстановы і праверан асабісты склад установы.

З апарату Акрстраху зьняты з працы па другой катэгорыі 2 супрацоўнікі, 2-м супрацоўнікам абвешчана суровая вымова і аднэй супрацоўніцы пастаўлена на від.

Зьвернута ўвага кіраўніка Акрстраху тав. Відосава на недастатковае і нерашучае ажыцьцяўленьне ім беларусізацыі апарату Акрстраху.

Зьвернута ўвага супрацоўніцы Акрстраха тав. Батвінік на неабходнасьць больш уважлівых адносін да выкананьня сваіх службовых абавязкаў.

Абвешчана суровая вымова супрацоўніку Сандлеру за няўважлівыя адносіны да праверкі дакумантаў гарантыйных служачых, у выніку чаго Дзяржстрах пацярпеў значную матар'яльную страту.

Абвешчана суровая вымова супрацоўніку Лізунову за факт выпіўкі на вёсцы, у час выкананьня службовай камандыроўкі.

Супрацоўніцы Богінай пастаўлена на від за неўважлівыя нетаварыскія адносіны да вучаніцы.

Вычышчан з апарату (па 2-й катэгорыі) супрацоўнік Жучкевіч, часова замяшчаўшы загадчыка Акрстраху, за скарыстоўваньне службовага становішча ў карысных мэтах. Гэта выявілася ў залічэньні на службу свайго родственьніка, жывучага разам з ім у аднэй хаце, грамадзяніна Кулакі, які ў мінулым быў вураднікам, служыў у польскай магістратуры, цяпер зьяўляецца буйным дамаўласьнікам, пазбаўлен выбарчых праў. Акрамя таго грамадзянін Жучкевіч захаваў ад адміністрацыі дзяржстраху сапраўдны твар Кулагі, (які дзякуючы гэтаму быў залічан у лік гарантыйных служачых).

Зьнят з работы ў Акрстраху (з дазволу працаваць на нізавой тэхнічнай рабоце) супрацоўнік, грамадзянін Мерліс, выхадзец з буйнай гандлёвай сям'і, які ўвесь час жыве разам з сваімі бацькамі, пазбаўленымі выбарчых праў. Грамадзянін Мерліс адносіўся да рабочай кліентуры надзвычайна груба і зарэкамэндаваў сябе з адмоўнага боку. На заводзе „Комунар" Мерліс аблаяў групу рабочых, за што быў выгнан з тэрыторыі заводу. Другога рабочага, які не пажадаў плаціць узнос па страхаваньню жыцьця, грамадзянін Мерліс абазваў негадзяем.

К.

Як „чакаюць" на Магілеўскай біржы працы.

Тав. Сяргей Пазьнякоў—былы чырвоны партызан, тры разы ранены, член прафсаюзу з 1922 году.

Ён жыве на прыватнай кватэры, прымушаны плаціць за яе вялікія грошы і ў дадатак мае на сваіх плячох двум утрыманцаў.

Беспрацоўным ён даўно. Зьвяртаўся і ў АВК, і ў інспэкцыю працы, і ў акрпрафсавет са сваімі заявамі.

На апошнія накладаліся суровыя і ляконічныя рэзалюцыі і большай часткай яны пасылалі т. Пазьнякова на біржу працы.

А на тэй біржы яму і па гэтую хвілю кажуць:

— Пачакайце... У першую чаргу пасылаем на работу беспрацоўных камандыраў запасу, беспрацоўных дэмабілізаваных...

Было-б гэта добра, каб сапраўды прытрымлівалася біржа наша такога парадку. А то-ж за два з паловай месяцы з беспрацоўных толькі аднаго камандыра паслалі, на завод „Адраджэньне".

Прыходзіцца „чакаць" на Магілеўскай біржы працы па паўгода...

А ў т. Пазьнякова сям'я галадуе. Становішча—з рук вон дрэннае...

Відаць, і адбыўшаяся надоечы чыстка апарату акруговае біржы працы мала спрыяла зьмяншэньню ў ім бюракратызму...

Л-ны.

НА ЗАМЕНУ ВЫЧЫШЧАНЫМ.

(*Магілеўшчына*).

У гор. Клімавічах на адкрытым сходзе гарадзкое партарганізацыі, прысьвечаным Міжнароднаму Чырвонаму Дню, дзе прысутнічала блізка каля паўтары тысячы асоб, адбываўся прыём у шэрагі КП(б)Б.

22 наджылых рабочых, з вытворчым стажам да 30 год, у адказ на падзеі на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы і ў зьвязку з праходзячай чысткай партыі, падалі заявы аб прыёме іх у партыю Леніна.

Між іншым, падалі гэткія заявы бацька з сынам—абодвы—рабочыя ад станка.

За апошнія поўгады Клімавіцкая партарганізацыя ўзрасла на 117 чал., з якіх 67—рабочых і батракоў, рэшта—сяляне-беднякі, пераважна—калгасьнікі.

У сувязі з такім шпаркім ростам партыйных шэрагаў утворана 5 новых вытворчых ячэек і 1 яч.—пры калгасе.

Ю.

Да ўвагі лесбелаўскіх безгаспадарнікаў.

Штогодна Барысаўскае аддзяленьне Лесбелу з-за сваёй безгаспадарчасьці выкідвае тысячы рублёў на вецер. Жыхары сыстэматычна ловяць лес, распілоўваюць і прадаюць.

Сумна і балюча глядзець на безгаспадарнікаў з Барысаўскага аддзяленьня Лесбелу. Тысячы рублёў, якія маглі-б стаць прыбытковасьцю для Лесбела, яны павольна ўплываюць вадой. Ніхто з працаўнікоў гэтым не пацікавіцца, часта можна ўбачыць прадстаўніка Лесбелу на беразе ракі Бярэзіны, па якой ўплывае шмат каштоўнага матар'ялу і апалу.

Можна напомніць цьвёрдалобым безгаспадарнікам, што каля ф-кі «Прафінтэрн» на беразе штодзённа жыхары ловяць шмат дроў і жардзей, якія распілоўваюць і потым прадаюць. Гэта добра вядома працаўнікам Лесбелу, яны гэта ўсё бачаць, але чаго шкадаваць, ад гэтага краіна не пабяднее, няхай ловяць на добрае здароўе і прадаюць,—вось як разважаюць лесбелаўскія працаўнікі.

Кожнаму вядома, што каля станцыі існуе лесбелаўская ветка, на якой праводзіцца ўпарадкаваньне лесаматар'ялу. Больш усяго прыбываемы матар'ял выцягваецца на бераг і адпраўляецца па чыгунцы ў другія мясцовасьці. У той час калі рабочыя выцягваюць лес на бераг за імі ніхто не глядзіць, няма ніякага кіраўніцтва працай. Лес больш усяго заўсёды зьбіваецца жардзямі, а пры вашоўцы, замест таго, каб гэтыя жэрдзі выцягваліся на бераг, яны кідаюцца рабочымі ў раку, а іншы раз і каштоўны лесаматар'ял таксама ўплывае. Сотні жардзей зносяцца вадой за горад, частка якога ловіцца жыхарамі і прадаецца, а частка сплывае і гніе на дне ракі.

Між тым, гэты багаты апал лесбелаўскія працаўнікі лічаць ім непатрэбным. З самай раньняй вясны да позьняй восені Лесбел цярае дзесяткі сажаняў багатага апалу, які каштуе дзяржаве тысячы рублёў.

Апроч таго, Лесбел трымае шэраг вартаўнікоў на берагох, але апошнія нічога ня робяць, якім магчыма было-б запрапанаваць затрымоўваць сплываемы лес. Вось гэта безгаспадарчасьць павінна быць зьнішчана ў самым тэрміновым парадку. Камісія па чыстцы апарату Лесбела таксама павінна прыняць гэта пад увагу.

Ал. Станкевіч.

Фэльетон

ДОБРЫЯ БУРАЧКІ З „ДРЭННАГА" НАСЕНЬНЯ.

Ажыцьцяўленьне пастаноў ураду аб падняцьці ўраджайнасьці ахапіла і ўзварушыла ўсе ўстановы. Кожны калектыў і паасобны працаўнік пачалі падрыхтоўчую і практычную працу па рознаму.

Вучань IУ групы Дрысенскай сямігадовай школы, Полацкай округі, прыстасаваў тапка набытую ў спажыўсаюзе бяздонную бочку з-пад селядцоў, куды рэгулярна стаў зьбіраць попел.

— Сымон,—кажа матка сыну,—выбірай свой попел, яго шмат ужо сабралася, а мне трэба печ тапіць. Паглядзімо, які ад яго смак будзе на полі.

Попел уласнасьцю Сымона зрабіўся толькі пасьля таго, як ён даведаўся ў школе аб яго каштоўнасьці, а гэта было чамусьці толькі ў гэтым годзе. Зараз неад'емлемай уласнасьцю вучня Сымона ў хаце зьяўляюцца дзьве рэчы: попел і плявацельніца, якую ён завёў у мінулым годзе, прывучыўшы сваіх пляваць ў яе і ўзяўшы на сябе абавязкі перамяняць пясок.

Адна з гарадзкіх школ г. Полацку ўрачыста павезла попел у падшэфную вёску. Дрэнна сустрэлі скрынкі з попелам старыя бабы, кажучы:

— Дзеткі як быццам і слаўненькія, але пры такім дрэнным надвор'і гэту паскуду з гораду ў вёску прывезьлі. У нас і так шмат такога і нават горшага бруду валяецца па-заўгольлю.

Аднак, такія заўвагі выклікалі толькі сьмех.

— Бабка, а бабка,—кажа вучань,—гэты попел дасьць лішнюю капу жыта.

Цяжка, але попел са школы гораду ўпяршыню праклаў сабе шлях у вёску на сялянскае поле.

Разварушаная грамадзкасьць, а з ёю і ўстановы ня прыпынялі працы, жадаючы сваім удзелам унесьці карысьць у агульную гаспадарчую справу. Магутны ўсебеларускі калектыў працаўнікоў Белсельсаюзу з вялікай напружанасьцю скончыў працу па вясеньняй пасеўнай кампаніі 9 чэрвеня, зрабіўшы заключны акорд згодна ніжэйнаступнаму акту.

АКТ.

1929 года, июня 9 дня, мы, нижеподписавшиеся представители Белсельсоюза т. Людский, аппробатор минской контрольно-семенной станции Толначов А. Р. и заведующий минской растениеводственной станцией т. Степанов составили акт о следующем.

Выделенные для ликвидации количества семян Б.С.С., согласно акта от 8-6-29 г., а менно: Тимофеевка—111,0 кг., брюква Гофманская—14,0 кг., брюква Красносельская—2,5 кг., редис—11,5 кг., свёкла полусахарная—30,0 кг., морковь—8,0 кг., клевер шведский 152 кг., клевер белый—149 кг. таматов—10 кг.,—принято для ликвидации минской растениеводственной станции, их часть ликвидировано путем использования в компостную кучу 25-5-29 г. в момент привоза Белсельсоюзом семян на опытную станцию, а остальные семена, а именно—редис мешок 47,5 кг., брюква № мяшка 50—14 кг., тимофеевка № 58—23 кг. и клевер № 63—118 кг., каковые были задержаны до повторного контрольного анализа, ликвидированы сего числа, при чем редька и брюква в компостную кучу, а клевер белый и тимофеевка путем рассыпки по сенокосу, о чем и составляем акт.

ПРЕДСТАВИТЕЛЬ БЕЛСЕЛЬБАНКА ОПЫТНОЙ СТАНЦИИ, КОНТРОЛЬНО-СЕМЕННОЙ СТАНЦИИ.

Пры зьнішчэньні прывезенага насеньня загадчык гаспадаркі расьлінаводнай станцыі т. Сьцяпанаў, праверыўшы па фактурах, устанавіў, што сярод зьнішчаемага насеньня ёсьць і такое, якое мае, згодна аналізу, наступныя адзнакі:

1) Цімафеёўка № 58—80 проц. усхожасьці і 99 проц. гаспадарчай годнасьці.

2) Пятрушка № 6—75 проц. усхожасьці і 79 проц. гаспадарчай годнасьці.

3) Радыса № 43—71 проц. усхожасьці і 98,6 проц. гаспадарчай годнасьці.

4) Бурачкі № 50—66 проц. усхожасьці і 99 проц. гаспадарчай годнасьці.

Затрыманае з вялікімі цяжкасьцямі т. Сьцяпанавым насеньне ў ліку 144 кілё ўзята Белсельсаюзам назад. Зваленае ў кампосную яму, а таксама частка рассыпанага пасенажаці насеньня дало добрыя ўсходы, пераплялося ў кудзелю і, насупроць жаданьням Белсельсаюзу, цягнецца ўверх, каб заявіць пратэст супроць такіх адносінаў да яго.

У часе зьнішчэньня насеньня жонка вартаўніка станцыі Зуеўская, узяўшы жменю бурачкоў, панюхала іх, пажавала і засадзіла імі свае градкі. Зараз Зуеўская любуецца надзвычайна добрымі ўсходамі і ростам, паказвае кожнаму селяніну, якія бываюць на станцыі, дадаючы, што гэтыя бурачкі з насеньня, якое бязбожныя „белыя саюзы" (Белсельсаюз) прывезьлі зьнішчаць.

Станцыя Пярэспа, як відаць, добры пункт для зьнішчэньня незаўсёды дрэннага насеньня, бо вясной, якаясьці арганізацыя тапіла шмат насеньня ў рэчцы, але з прычыны таго, што рэчка Сьвіслач нятлыбокая і маларыбная, яна не магла схаваць брудную справу. Берагі, а месцамі і дно рэчкі ўбраліся прыгожымі ўсходамі, якія выклікалі міліцыянэра шукаць праз апрос таго, хто тапіў насеньне.

Калі будуць і далей такія адносіны з боку Белсельсаюзу да дарагога насеньня, ня кажучы ўжо аб якасьці аналізаў, дык агітацыя Зуеўскай паказам будзе расьці, а зьявішчы са зьнішчэньнем насеньня могуць паўтарацца і пры правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі.

Варта было-б Белсельсаюзу завесьці ў сябе штатную адзінку Сымонкі, усклаўшы на яго абавязак сачыць за спраўнасьцю белсельсаюзаўскай плявацельніцы. Ад гэтага магла-б значна ўзбагаціцца кампостная куча за кошт белсельсаюзаўскага бруду.

Базылевіч.

Максымум увагі хлебазагатоўкам!

Рыхтуемся да хлебазагатовак.

(Гутарка з інструктарам-эканамістым Белкаапсаюзу т. Фрыдлянскім).

Белкаапсаюзам у сучасны момант праводзіцца агляд і рамонт ссыпных памяшканьняў для ссыпкі збожжа. Памяшканьні праветрываюцца і дызынфэкцыруюцца, прыймаюцца меры забясьпечаньня збожжа ад мышэй і іншых шкоднікаў збожжа. Маючы на ўвазе, што хутка распачнецца прыём жыта,—закупляецца неабходны інвэнтар, як, вагі, мяшкі і г. д.

У некаторых акругах праведзены спэцыяльныя гандлёвыя нарады з удзелам старшынь спажывецкіх каапэрацыяў, дзе былі пастаўлены пытаньні тэхнічнае падрыхтоўкі да хлебазагатоўчае кампаніі.

У падрыхтоўчай працы на мясцох, згодна дадзеных саюзам дырэктыў, галоўнае месца займае пытаньне стварэньня навокал хлебазагатовак шырокай грамадзкай думкі. У гэту працу, у першую чаргу—уцягнуты ўвесь каапэрацыйны актыў вёскі і райёнаў, які с в а і м прыкладам, здаючы лішкі збожжа першым, зацікавіць іншае насельніцтва, уцягнуўшы яго ў працу па хлебазагатоўках.

Апрача таго, у працу па загатоўцы ўцягваюцца ўсе мясцовыя і прафсаюзныя арганізацыі.

Белкаапсаюзам дадзены цьвёрдыя заданьні хлебазагатоўкі ў акруговыя саюзы каапэрацыі, якія ўжо на месцы, маючы фактычныя даныя, будуць разьмяркоўваць якому райёну і колькі трэба будзе здаць збожжа ў хлебазагатоўчую арганізацыю.

У гэтым годзе мяркуецца хлебазагатоўчы плян давесьці да самага сельсавету; сельсавет будзе нясьці адказнасьць за сваю часовую здачу збожжа разам з хлебазагатоўчаю арганізацыяй, якая замацоўваецца за даным сельсаветам.

Дзякуючы гэтаму мерапрыёмству між паасобнымі арганізацыямі, якія загатаўляюць хлеб (Хлебсаюз, Белсельсаюз і Белкаапсаюз),—конкурэнцыі ня будзе.

Белкалгассаюз да хлебазагатовакпадрыхтаваны

Белкалгассаюз разаслаў па мясцох пляны наводле якіх калгасам прапанована здаць усе лішкі жыта ў разьмеры 10335 цэнтнэраў, сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Усімі акруговымі калгассаюзамі пасьля абгаварэньня гэтага пытаньня на мясцох лічбы заданьня здачы жыта былі павялічаны на 8000 цэнтнэраў. Гэты лік жыта (18335 цэнтнэраў) калгассаюзы здадуць сельска-гаспадарчай каапэрацыі не пазьней кастрычніка сёлетняга году.

У раёнах праведзены сходы ўсіх калгасьнікаў, дзе пастаўлена пытаньне аб сваечасовай здачы жыта да 1 кастрычніка гэтага году.

Белсельтрэст у хлебазагатоўках.

Па заданьню ЭКАНОКАНмінарады Белсельтрэст павінен здаць Саюзхлебу 21.000 цэнтнэраў спажывецкага жыта ў дзьве чаргі: 60 процантаў Белсельтрэст павінен здаць да кастрычніка, а 40 процантаў у кастрычніку. Жыта гэта будзе здадзена Саюзхлебу пасьля абмену яго на сялянскае, таму, што Белсельтрэст мае толькі гатунковае жыта. Апрача гэтага Белсельтрэст здасьць 10.000 цэнтнэраў гатунковага жыта НКЗ дзеля разьмеркаваньня яго па калгасах. Плян хлебазагатовак будзе выкананы сваечасова і поўнасьцю.

Конкурс на лепшы загатоўчы раён.

Гомель, 10-8. Каб лепш выканаць плян экспарту другарадных відаў сельска-гаспадарчай сыравіны абвешчан конкурс на лепшы загатоўчы раён. Для кіраўніцтва гэтай працай створана акруговая конкурсная камісія.

Скончыўся „тыдзёвік ураджайнасьці".

Полацак, 10-8. Гэтымі днямі скончыўся „тыднёвік ураджайнасьці", які прайшоў пад лёзунгам: за выкананьне прынятага вясной аграмінімума, пашырэньне пасяўной плошчы, падрыхтоўка да асеньняй сяўбы і інш.

Тыднёвік узварухнуў усю грамадзкасьць. Былі накіраваны спэцыяльныя брыгады на вёску, якія правялі сялянскія сходы, з дакладамі аб падвышэньні ўраджайнасьці і інш.

Пачалася чыстка насеньня.

Гомель, 10-8. У некаторых раёнах акругі пачалася чыстка насеньня. Па пляну акрэмаддзела мяркуецца ачысьціць 16 тысяч тон насеннага матар'ялу. Каб выканаць гэта заданьне ў акрўзе будзе працаваць 325 зерначышчальных машын.

Дапамагае калектыў.

Магілеў, 10-8. Дружна адгукнуўся калгас „Араты" на заклік беднаты журавіцкай аб дапамозе ў правядзеньні асеньняга севу.

Тры выезды правялі калгасьнікі па вёсках Хатаўнянскага сельсавету. У часе выезду узарана дзевяць надзелаў параніны пад азіміну. Зроблена апрацоўка зямлі тром бедняком, пецярым удовам і сям'і чырвонаармейца.

Юр.

САВГАСЫ І КАЛГАСЫ

Ў АВАНГАРДЗЕ ХЛЕБАЗАГАТОВАК.

Аграмаджаны сэктар сельскае гаспадаркі—савгасы і калгасы—правялі веснавую пасеўную кампанію пасьпяхова, хоць і ў гэтай веснавай пасеўнай кампаніі, праўда, у меншых разьмерах, чым у мінулай, выявіліся недахопы работ дастаўляючых і крэдытуючых дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый. Несваечасова выдаваліся вызначаныя савгасам і калгасам крэдыты, не ў дастатковых разьмерах і са спазьненьнем дастаўляліся машыны, мінэральныя ўгнаеньні і г. д.

Кулакі і заможныя пласты вёскі вялі злосную агітацыю і як мага перашкаджалі калгаснаму руху. Але кулацкія падкопы ня спынілі вытворчага ўздыму бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. У гэту вясну бедната і батрацтва яшчэ раз паказалі сваю высокую палітычную сьвядомасьць, а серадняк рашуча стаў на шлях аднаўленьня і разьвіцьця сваёй гаспадаркі праз калектывізацыю яе. Гэта адчыненае шырокі шлях разьвіцьцю асноўнай масы сялянства—бедняку і серадняку—па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі.

Савгасы ў пасеўную кампанію выканалі плян пашырэньня пасеваў з перавышэньнем, па папярэдніх даных, на 9,6 проц., што ў сваю чаргу зьявілася практычнай праверкай магчымасьці рацыянальнага выкарыстаньня цягавай сілы і сельска-гаспадарчых машын і магчымасьці павялічэньня нагрузкі на адзінку рабочай жывёлы пры добрай арганізацыі. Калгасы-ж у веснавую пасеўную кампанію выканалі свае пляны з перавышэньнем у сярэднім на 30 проц., а ў паасобных раёнах гэта перавышэньне даходзіць да 100 проц.

Самым характэрным і радасным зьявішчам вясны гэтага году зьяўляецца арганізацыя на абшарах СССР да 140 буйных калгасаў з разьмерамі пасеўнай плошчы ў паасобных калгасах звыш 2 тыс. гэктараў, а ў некаторых да 15 тыс. гэкт. Уся плошча пад буйнымі калгасамі дасягае 740 тыс. гэкт. Астатняя маса калгасаў у параўнаньні з мінулым годам узбуйнілася на 50 проц., г. зн. калі ў сярэднім на калгас прыпадала ў мінулым годзе 60 гэктараў пасеву, дык у гэтым годзе на адзін калгас прыпадае 90 гэкт.

Вясна гэтага году зьяўляецца першым годам, калі калгасы праводзілі ў масавых разьмерах мерапрыёмствы па падвышэньні якасьці сваёй вытворчасьці. Да ліку асноўных якасных палепшаньняў адносяцца пасевы гатунковым насеньнем да 70 проц. плошчы, пратручваньне і адгатункоўваньне амаль што ўсёй колькасьці пасеўнага збожжа, дапасаваньне мінэральных угнаеньняў у значных разьмерах у райёнах інтэнсыўных культур і г. д. Усе гэтыя колькасныя і якасныя посьпехі веснавой пасеўнай кампаніі па савгасах і калгасах даюць падставу чакаць падвышэньня ўраджайнасьці, шмат перавышаючай плян (меркавалася, што ў калгасах ураджайнасьць будзе вышэй на 25 проц., чымся ў індывідуальных гаспадарках).

Пакуль яшчэ цяжка скласьці дакладны хлебафуражны балянс, але ўжо папярэднія падлікі даюць падставу вылічаць таварныя лішкі хлеба старых савгасаў РСФСР да 200 тыс. тон (12 млн. пуд.). Новыя савгасы Зернатрэсту ў першым-жа годзе свайго існаваньня дадуць звыш 90 тыс. тон (5500 тыс. пуд.), а калгасы павінны даць да 1640 тыс. тон (каля 100 млн. пуд.). Гэткім чынам, па самаму прыблізнаму падліку аграмаджаны сэктар сельскае гаспадаркі здасьць дзяржаве таварнага хлеба 1930 тыс. тон (118 млн. пуд.), ня ўключаючы таварнай прадукцыі савгасаў Украіны і блізкіх да калгасаў прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў. Гэткім чынам, удзел аграмаджанага сэктару сельскае гаспадаркі ў хлебаснабжэньні прамысловых цэнтраў і спажыўляючых райёнаў набывае значную ўдзельную вагу.

З пункту гледжэньня інтарэсаў народнае гаспадаркі важан ня толькі агульны разьмер таварных лішкаў хлеба, які паступае ад аграмаджанага сэктару, але ня менш важна, у якія тэрміны здаецца гэты хлеб. Аграмаджаны сэктар сельскае гаспадаркі паскоранай здачай хлеба сур'ёзна дапаможа дзяржаве ў справе скасаваньня цяжкасьцяў з харчам, якія звычайна асабліва востра адчуваюцца ў першыя месяцы кожнай новай хлебнай кампаніі. У той час, калі кулацкая і заможная частка вёскі асабліва злосна хаваюць лішкі хлеба, стараючыся спэкуляваць на хлебных цяжкасьцях на рынку, аграмаджаны сэктар, паскараючы здачу збожжа, практычна прадэманструе супольнасьць сваіх інтарэсаў з сацыялістычнай прамысловасьцю, якая ўсё больш разьвіваецца.

Асабліва важным момантам дзеля вырашэньня задачы ўздыму ўраджайнасьці і ў індывідуальных сялянскіх гаспадарках зьяўляецца пашырэньне ў іх пасеваў палепшаным гатунковым насеньнем. Савгасы і калгасы па разьвядзеньню чыстагатунковага і палепшанага насеньня зьяўляюцца асноўнай базай сельскае гаспадаркі.

Таму другой ня менш важнай задачай аграмаджанага сэктару зьяўляецца сваечасовая здача свайго чыстагатункованага насеньня каапэрацыі і дзяржзагатоўцам, дзеля таго, каб яны здолелі забясьпечыць азімым насеньнем бядняцка-серадняцкае сялянства.

Уборчая і хлебазагатоўчая кампаніі ўскладаюць вялізарную задачу на савгасы і калгасы, выканаць якую магчыма толькі пры ўмове, калі кожны рабочы савгасу, кожны калгасьнік уразумее ўсю важнасьць і сур'ёзнасьць гэтай працы для ўсёй краіны.

Трэба ўзьняць і актывізаваць працу вытворчых нарад. Усе вінцікі гэтых аграмадных вытворчых мэханізмаў павінны быць прыведзены ў належны выгляд і добра складзены. Толькі пры гэткай умове можна пасьпяхова выканаць гэтыя задачы.

Асноўным зьвяном, ад якога цалкам залежыць выкананьне калгасамі і савгасамі заданьняў па здачы хлебных лішкаў, зьяўляецца ўборачная кампанія і сваечасовы абмалот ураджаю. Гэтай працы неабходна надаць баявы характар і прыняць усе арганізацыйныя захады дзеля пасьпяховага правядзеньня яе.

Неабходна ў кожным савгасе і ў кожным калгасе мець падрабязны календарны плян уборкі і абмалоту ўраджаю. Пры складаньні гэтага пляну неабходна выходзіць з таго, што савгасы і калгасы павінны даць максымальную часьць свайго таварнага хлеба ў ліпені і жніўні, а поўную здачу ўтварыць не пазьней 2 месяцаў з пачатку ўборкі ўраджаю.

Дзеля правядзеньня тэрміновай уборкі і абмалоту савгасы, і асабліва калгасы, недастаткова забясьпечаны машынамі. Неабходна тэрмінова зьвязацца са ўсімі дастаўчымі арганізацыямі дзеля завозу гэтых машын у калгасы, а таксама шырока выкарыстаць пракатныя пункты, якія ўжо ёсьць на сяле.

Як ва ўборцы, так і ў малацьбе неабходна ўстанавіць зьменныя работы. Савгасы павінны будуць працаваць у 2 зьмены па 10 гадзін, а калгасы ў многіх выпадках будуць працаваць у 3 зьмены. Практыку і вопыт веснавой пасеўнай кампаніі, калі калгасьнікі працавалі на трактарах у працягу цэлых сутак, неабходна шырока выкарыстаць і пры ўборцы і малацьбе хлябоў.

У гэты напружаны перыяд савгасам і калгасам трэба прысьці на дапамогу. Дзеля ўдзельнічаньня і кіраўніцтва ўборачнай кампаніяй і абмалоту збожжа неабходна мабілізаваць кадры адказных працаўнікоў савгаснай і калгаснай сыстэмы, а таксама завастрыць увагу ўпаўнаважаных, якія пасылаюцца акруговымі партыйнымі арганізацыямі, у першую чаргу на правядзеньне ўборкі, абмалоту і здачы насеньня савгасамі і калгасамі. Армія аграномаў савгасаў і калгасаў уся павінна быць мабілізавана дзеля правядзеньня гэтых кампаній. Неабходна, каб кожны працэс працы быў пабудаваны па парадзе агранома, тэхніка, улічваючы асаблівасьці кожнага савгасу і калгасу.

Тэрміновае правядзеньне ўборачнай кампаніі, абмалоту і здачы хлябоў патрабуе налічча ў савгасах і калгасах значных зваротных сродкаў. Крэдытныя і хлебазагатоўчыя арганізацыі павінны забясьпечыць калгасы і савгасы зваротнымі сродкамі ў парадку выдачы авансаў. Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на сваечасовую дапамогу машынамі і грашыма буйным калгасам, бо ў іх будзе адчувацца асаблівая патрэба. У адзнаку ад савгасу буйныя калгасы маюць недастатковы вопыт, слаба забясьпечаны кадрамі людзей, а між тым паасобныя буйныя калгасы сёлета будуць здаваць да 16 тыс. цэнтнэраў (100 тыс. пуд.) хлеба.

Апрача правядзеньня масавай растлумачальнай працы сярод раб

ЛІТАРАТУРА--МАСТАЦТВА--КРЫТЫКА.

РЫГОР ПАПАРАЦЬ.

ГАРАЦЬ АГНІ.

З глыбокім пачуцьцём сябру і бацьну прысьвячаю.
Р. П.

Гараць агні.
Электра топіць
У завулках цемень да зары,
Нурга рагоча...
Жах разносіць,
Балыша вецер ліхтары.
На раздарожжы вуліц гулкіх,
Рукі азяблай перабор,
На струнах сэрцы нашы журыць,

У небе тухне замяць зор.
Пурга рагоча..
Зубы скаліць.
У пурзе грукочуць пяруны...
А мы ідзем... Мы спынім замяць!...
Нам сьвецаць ясна ліхтары.

Ленінград,
23-XI-1927 г.

М. ХВЕДАРОВІЧ.

ГОЛАС ДЗЁН

О, ня стрымаць!..
Адходзяць дні старыя,
Як ня стрымаць
Эпохі новай рух.
Бо хутка напава
Запаліць індустрыя
Над Беларусьсю
Новую зару.

Гудкамі тысячы
Магутных электрастанцый,
Абудзіць ціш
Засмучаных балот.
І новых дзён
Сталёвыя паўстанцы
Ў краіне зробяць
Пераварот.

О, сьветлы дзень!
О, радасьць неабсяжна,
І моладасьці прыць
Нікому не дагнаць...
Я ў ногу йду
З эпохаю адважна
Вучыцца
І перамагаць!

Хай голаву злажу
Упарта ў цяжкай працы,
Ні кроку ад жыцьця!
Сягоньня лёзунг мой.
Я не хачу
Двудушных дэкларацый
Падпісываць
Дрыжачаю рукой...

Я ненавіджу
Ціхую ўхмылку,
Мяшчанскі супакой,
Задавальненьня сон.
Няхай сабе
Зрабіў і я памылку
Сьцігаючы з эпохай
Ў унісон.

О! ня стрымаць...
Адходзяць дні старыя,
Як ня стрымаць
Эпохі новай рух.
Сталёваю рукой
Запаліць індустрыя
Над Беларусьсю
Новую зару.

7-VIII—29 г. Менск.

Каму патрэбны гэткія фільмы?

Сяджу ў кіно „Спартак". На экране паказваюць фільм вытворчасьці Белдзяржкіно „Маска сорвана".

Я сяджу і вьдзіўляюся.

На экране мільгаюць варшаўскі Бельвэдэр, баляваньне паноў і фантаны ваевод, пагулянкі і маскарады.

Фільм як быццам рэвалюцыйны. Багаты афіцэр генэральнага штабу польскай арміі Конрад Змольскі пасьля замежнай камандыроўкі зварачаецца на бацькаўшчыну. Ён ня ўлёўнен у правільнасьці палітыкі свайго ўраду, ён асуджае што робіцца ў яго краіне. Спатканьне з беднай аўрэйкай, якая раней жыла ў Савецкай Украіне, даканае ператварэньне польскага афіцэра, Ён робіцца амаль рэвалюцыянэрам.

Але тут на сцэну выступае начальнік польскай дыфэнзывы, які зайздросьціць Конрада таксама да багатай вядомай панны Ванды.

Чартоўская махінацыя з удушэньнем ў турме арыштаванай калежанкі яўрэйкі Лідзіі, фальшывыя лісты і г. д.

Нарэшце, суд над Конрадам, прысуд да катаржных работ і пасьля апраўданьне з прычыны яго ганаровага паходжаньня.

Мы зусім ня хочам сказаць, што гэты фільм нічога ня варты, што тыпы, якія там прыведзены няжыцьцёвыя, або што-небудзь накшталт.

Зусім ня так. У фільму зусім ня блага паказана раскошнае жыцьцё польскіх паноў, антысэмітызм, баляваньня і маскарады.

Аб'ектыўна гаворачы ўпаўне магчыма гэткае становішча, што багаты польскі афіцэр расчараваны ў сваім ўрадзе, што яму больш культурнаму, чымся яго таварышам па палку агідны барбарствы і дзікі фанатызм яго асяродку.

Усё гэта, паўтараю, упаўне магчыма.

Але дзе рабочыя, дзе клясавая барацьба пралетарыяту ў Польшчы? У працягу цэлых доўгіх сямі частак карціны няма нават намёку на сучасную клясавую барацьбу, якая востра разьвівецца зараз у дзяржаве пана Пільудзкага.

Не паказана ні фабрыка, ні завод. Не паказаны быт рабочых, яго барацьба, яго вострая клясавая нянавісьць да сваіх прыгнетацеляў, яго часамі нечалавечныя патрэбы і голад.

Нічога гэтага няма. А толькі балы і маскарады, толькі жыцьцё купкі багатых прадстаўнікоў буржуазеі і афіцэрства, якія варуцца ва ўласным саку.

У нас вельмі мала, у нас амаль няма кіно-фільм, якія-б малявалі барацьбу пралетарыяту Захаду супроць капіталу, якія-б паказвалі яго быт, яго пакуты і імкненьні.

Ці варта таварыць наколькі настойліва неабходны, некалькі пажаданы нам менавіта гэткія фільмы.

Вось чаму робіцца так да болю прыкра, калі бачыш, што Белдзяржкіно траціць вялікія сродкі на пастаноўку ня толькі нам непатрэбнага але, бадай, шкоднага фільму.

Шкоднага у тым сэнсе, што не паказвае зусім барацьбы польскага пралетарыяту супроць капіталу. Гэты фільм зможа ў некаторай часткі рабочай аўдыторыі стварыць уражаньне, што польскі пролетарыят стаіць у баку ад барацьбы ў Польшчы супроць рэакцыі, супроць капіталістаў, а гэту барацьбу вядуць (па карціне выходзіць так) нейкія выскачкі з буржуазеі.

Ці Белдзяржкіно не змагло замест фільму, „Маска сорвана" стварыць другі фільм, у якім можна было-б паказаць ва ўсёй вострасьці клясавую барацьбу польскага пралетарыяту? Тэм нам здаецца дзеля гэтага больш чым дастаткова.

Вядома, маглі-б. І гэткі фільм да крайнасьці нам патрэбны мы толькі бы віталі.

Адчынілася шырокая рабочая кіно-канфэрэнцыя Белдзяржкіно і ЦСПСБ.

Неабходна ўзьняць пытаньне на гэтай кіно-канфэрэнцыі пытаньне аб утварэньні сапраўдных клясава-вытрыманых кіно-фільмаў, якія-б малявалі і барацьбу пралетарыяту капіталістычных дзяржаў Заходняй Эўропы, Усходу і Амэрыкі.

НБП.

ЦІМ. ЗАРЭЧНЫ.

ПРЫЯЖДЖАЙ ДА МЯНЕ, ДРУЖА.

Дружа, любы. Прыяжджай да мяне як найхутчэй. Сёньня-ж запрагай шэрага і сьпяшайся на станцыю. Згары яна, работа твая,—адкладзі на тыдзень-другі, прыяжджай да мяне.

Як весела і шчасьліва праходзіць час у горадзе маім. Ня людзі, а залатыя арэхі знаёмыя мае. Ня жыцьцё, а скрыжаваньне гісторыі ў нас. Я пазнаёмлю цябе з абставінамі работы маёй, са знаёмымі і знаёмкамі пазнаёмлю. Будзеш у захапленьні ад усяго новага і радаснага ты. Прыяжджай да мяне, дружа любы мой.

Першым чынам, калі прыдзеш да кватэры маёй, на парозе сустрэне цябе Алёна Арыстархаўна—гаспадыня мая, уласьніца двухпавярховага дому. Крыху згорбленая, хітраватая і з вачыма без параўнаньня, але ўсётакі з манэрамі былой гранд дамы былого добрага часу. Яна агледзіць падазрона цябе з верху ўніз, прыпыніць погляд на ботах тваіх, што сьмяюцца і мазурку пяюць, грацыёзна сядзе на палінялы дыван і скажа табе:

— Казімір Казімірыча дома нет. Яны сьпяць.

Любіць Алёна Арыстархаўна ўспомніць дзевяцьсотыя годы, калі яна перажывала мядовы месяц, піла моладасьць, цалавала мужа і загадвала лёкаю адказваць гасьцям:—Барыні дома нет,—яны сьпяць.

Ты не зразумееш яе і захочаш прайсьці ў мой пакой.

— Малады чалавек, прашу вас,—пасядзіце крыху ў гасьцінай,—я пайду далажу аб вашым прыходзе Казімір Казімірычу.

Яна пойдзе ў сваю спальню, пастаіць паўхвіліны і зноў прыдзе да цябе. Распытае адкуль ты, хто ты і чаго прыехаў да „Казімір Казімірыча".

— А я Елена Ерестарховна,—пазнаёміць яна сваю асобу з тваёй, калі ты растлумачыш ёй усё:

- Выбачайце, а як Казімір?—недалікатна спыніш ты яе на самым цікавым месцы.

— Казімір Казімірыч? Так, так,—я далажу аб вас.

Ізноў зьвярнецца яна праз поўхвіліны і пачне расказваць табе аб далёкім, былым і любым, дарагім.

— Мы мелі маёнтак за Воршай і броварны завод у ім. Рабочых не прымушалі цяжка працаваць, харчавалі як арыстакратаў і плацілі як інжынэрам. Яны былі задаволены намі: «ваша благародзьдзе", „пан і пані", «ваша сьветлая вялікасьць» называлі нас. Яны-б і не прагналі нас у рэвалюцыю, але мы с а м і пакінулі маёнтак. Усякія бываюць людзі і ўсякае можа здарыцца.

Ты будзеш пазяхаць, паглядваць у бок майго пакою, а яна без перапынку будзе расказваць аб жыцьці за Воршай, у дзіўным і прыгожым маёнтку. Ёй трэба каму-небудзь расказаць аб гэтым і яна раскажа, абавязкова раскажа табе ўсе, ад пачатку да канца. Мне яна таксама штодзень аб гэтым расказвае, але я ўцякаю ў свой пакой і абяцаю даслухаць яе няскончаную аповесьць калі-небудзь вечарам або ў сьвята. І яна верыць мне, чакае таго моманту, калі зможа выкласьць ўсю сваю душу, мары, надзеі.

Я пачую вашу размову, кіну чытаць Чэхава і выйду ў гасьцінную.

— Андрэй...

— Казімір...

І мы ня знойдзем болей слоў. Будзем глядзець адзін другому ў вочы, моцна ціснуць рукі і апазнаваць Андрэй Казіміра, Казімір—Андрэя. Мы ў вачох прачытаем душу адзін другога, даведаемся аб настроях нашых, думках, поглядах на рэчы і радасьцях агульных.

Толькі пачне заяўляць аб сабе самавар, прыдзе Пятро Хмялёвы,—паэта сучасных паэтаў. Кволая постаць, мяккія абрысы твару, сінявасільковыя вочы (як у паэтаў) і вясёлы абліты радасьцю Хмялёвы. Яго гадаваў сьмех і ён, здаецца, полуднае са сьмехам і рыфмаванымі радкамі.

— Ну, што новае напісаў, Пятро?

— Наэму...Адказ крытыкам і крытыканам. Губяць таленты...чыноўнікі... Людзі «дважды два—чатыры».

Я заспакою Хмялёвага. Паабяцаю дапамагчы і прасунуць у сьвет (хоць я і ня маю для гэтага ніякай магчымасьці, але Пятрака толькі гэтым можна заспакоіць).

Будзем піць гарбату, жартаваць і сьмяяцца. Наш сьмех пачуе Аркадзь Анатольлевіч, сусед па 30-ціпроцантнай норме, і ціхімі крокамі, крадучыся войдзе ў мой пакойчык.

— Чую сьмяюцца, дай, думаю, зайду.

— Калі ласка Аркадзь Анатольевіч, сядайце. Мо' шклянку гарбаты даць?

— Не, не, дзякую, я толькі палуднаваў.

Аркадзь Анатольевіч, бухгальтар якоесьці бухгальтэрыі, другажон на другі дзесятак, Дон-Жуан гораду №-ск, не адмаўляцца ня ўмее. Ён выч'е шклянку, я другую нальлю, ён будзе адмаўляцца і піць, зноў адмаўляцца і піць. Дзіўная натура. У ім аб'ядналіся вузкі эгаізм і шырокая любоў да людзей, хітрасьць лісіцы і адкрытасьць мядзьведзьдзя, бязьлітасны наступ і галубінная шчырасьць. Буйная, ядраная і крохкая, кволая натура. І заўсёды застаецца для мяне незразумелым—чаму ён карыстаецца вялікай папулярнасьцю як Дон-Жуан.

— От і кажу я, паважаныя таварышы,—цэдзіць праз зубы Хмялёвы, паклаўшы нагу на вольнае крэсла,—от і кажу я, што літаратура ня зможа адбіваць сёньня сёньняшні дзень. Сёньняшняя літаратура ня зможа сёньня адбіваць. Учарашняя можа, а сёньняшняя —ніколі. Гэта даказвае гісторыя. Нават матэрыялісты згодны прызнаць гэта.

— А многа ты адбіў учарашняе?—сьмяецца Аркадзь Анатолевіч.

— Нашто пераходзіць на асабістыя рахункі? Давайце аб'ектыўна вырашым гэта пытаньне.

— Тэорыя... Аб'ектывы...—ніяк ня можа стрымацца Дон-Жуан,—от я практычна адбіваю сёньняшні дзень у сваёй літаратуры.

— Сальдо... Дэбэт ..—ня вытрымлівае Хмялёвы.

— А хаця-б і так. Сальдо і дэбэт куды карысьней «даляў мурожных» тваіх.

— Ды мурожных даляў ня бывае.

— Бываюць. Усякая даль бывае.

— І ня даль, а далеч, далячынь.

— Таму, што рыфму лягчэй падбіраць: далячынь, адучыў, лагчыны, сачыў, айчын.

— Хаця-б і патэтаму.

Спрэчкі скончаны. Прыяцелі прымірыліся. У пакойчыку душна. Посьцілкі дыму вісяць над нашымі галовамі.

— Праўда, Андрэй, у мяне лепш, чым у цябе?—запытваюся я.

— Можа і так, але і ў мяне добра: жытнія палі, сасновыя бары, саламяныя хаты, пах араматны на лугох.

— Так, так,—машынальна паўтараю я:—палі, нязжатыя палоскі... Аўсы, грэчка, канюшына. Пах араматны на лугох...

. . . . . .

— Прыяжджай да мяне, дружа. Работа не зьбяжыць і без цябе нічога ня зьменіцца. Прыяжджай у мой горад. Пазнаёмлю са знаёмымі і знаёмкамі. І я да цябе прыеду. Узяў ужо білет. Заўтра буду ў тваім пракураным сельсавецкім будынку.

А ліст гэты—фальш і мана. Сам прыеду—усё раскажу.

Лепш цыгарка самасейкі, чым сыгарэта мяшчанства.

Г. Менск.

НА БАРАЦЬБУ З НЯПІСЬМЕННАСЬЦЮ.

СВАЕЧАСОВА ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

На пасяджэньні прэзыдыуму Цэнтральнага Савету таварыства «Прэч Няпісьменнасьць», пад старшынствам **тав. Чарвякова** было ўсебакова абгаворана пытаньне аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці.

Дакладчык НК Асьветы адзначыў, што імі распрацован пэрспэктыўны плян ліквідацыі няпісьменнасьці на наступны навучальны год. За сродкі мясцовага бюджэту органаў Нарасьветы мяркуецца ліквідацыяй няпісьменнасьці ахапіць па ўсёй БССР 180000 чалавек і 12000—школамі малапісьменных. На вестках атрыманых з акруговых інспэктарыятаў нарасьветы, для ажыцьцяўленьня гэтага пляну ўносіцца ў каштарысы будучага бюджэтнага году 1.268.000 руб., Наркамфін-жа скарочвае гэту суму да 1.080 тысяч рублёў.

Па лініі таварыства «Прэч Няпісьменнасьць» у наступным годзе павінна быць ліквідавана няпісьменнасьць сярод 32.000 чалавек і школамі малапісьменных ахапіць 3.200 чалавек.

Апрача таго па лініі прафарганізацый мяркуецца ахапіць 16.000 няпісьменных і 6.000 малапісьменных членаў прафсаюзаў. Такім чынам у наступным годзе, наводле пляну Наркамасьветы, павінна быць ахоплена ліквідацыяй няпісьменнасьці і школамі малапісьменных каля 260.000 чалавек.

Наркамасьветы мяркуе па ўсіх раёнах БССР арганізаваць 2-хтыднёвыя курсы па падрыхтоўцы ліквідатараў. Праз курсы будуць прапушчаны камсамольцы, вучні старэйшых клясаў сямігодак і наогул увесь культурны актыў вёскі, якія пажадае прынесьці карысьць у галіне ліквідацыі няпісьменнасьці. Да працы па ліквідацыі няпісьменнасьці будзе прыцягнута і нашае настаўніцтва, якое будзе ізўча сваім добрым традыцыям і не застанецца ў баку ад такой важнай працы.

У галіне забясьпечаньня падручнікамі справа стаіць далёка ня добра. Белдзяржвыдавецтва надрукавала 100000 лемантароў, чаго, зразумела недастаткова для 260 тысяч, што мяркуецца ахапіць ліквідацыяй няпісьменнасьці. Больш таго, нават і гэтыя лемантары яшчэ ў большасьці ляжаць на складах Белдзяржвыдавецтва, бо акругі, не зважаючы на шэраг прапаноў Наркамасьветы, не сьпяшаюцца зрабіць заяўкі на патрэбную колькасьць падручнікаў. Толькі Гомельшчына, Бабруйшчына і Мазыршчына паклапаціліся сваечасова падумаць аб падручніках, а іншыя акругі моцна сьпяць. Выбачайце, Полаччына таксама набыла... 100 падручнікаў, што, пры пляне ліквідацыі няпісьменнасьці сярод некалькіх дзесяткаў тысяч чалавек, па думцы працаўнікоў Полаччыны, зусім дастаткова.

Дзякуючы такой нядбайнасьці акруговых інспэктарыятаў Нарасьветы, дагэтуль не ажыцьцяўляецца наказ наркома асьветы т. Баліцкага аб надрукаваньні яшчэ 100.000 лемэнтароў. Пры такім тэмпе падрыхтоўцы да новага навучальнага году мы можам быць сьведкамі, калі падручнікі пападуць у лікпункты ў канцы навучальнага году.

Што датычыцца іншых падручнікаў, дык і тут справа ня лепш. Наркамасьветы не падумаў зрабіць заказаў на падручнікі для ліквідацыі няпісьменнасьці сярод нацыянальнасьцяў, мала падручнікаў і для школ малапісьменнасьці.

* * *

Даклад тав. Наўмёнка выклікаў ажыўленыя спрэчкі, выказаліся ўсе прысутнічаючыя.

Тав. Гальбрайх (ЦСПСБ) знаходзіць, што плян складсьці будзе ня так цяжка, бо па лініі прафсаюзнай зроблен сталы вучот няпісьменных. Не пытаньне аб сродках рбудзе іграць галоўную ролю,—куды складаней і цяжэй пытаньне—хто і як справіцца з пастаўленай задачай па ліквідацыі няпісьменнасьці. Саюзы ўжо бяруцца за ажыцьцяўленьне гэтага пляну, а з вучэбнымі дапаможнікамі і з падрыхтоўкай кадраў ліквідатараў дагэтуль пытаньне ня вырашана. Таварыства „ПН" павінна ўзяць на сябе звыш вызначанага плянам дадатковую працу і кінуць свае сілы і сродкі на слабыя месцы. Трэба ні на адзін дзень не адкладваючы, даць ясную ўстаноўку як і якімі мэтадамі весьці працу.

Тав. Мухін лічыць, што ва ўмовах гарадоў можна будзе за год ліквідаваць няпісьменнасьць сярод рабочых, бо пытаньне з кадрамі ў горадзе будзе стаяць больш-менш здавальняюча, трэба толькі сваечасова распрацаваць гэтае пытаньне.

Шэраг таварышоў адзначалі, што важнае пытаньне—гэта пытаньне з забясьпечаньнем падручнікамі і кадры ліквідатараў.

У заключэньне выступіў тав. Чарвякоў, які вызначыў чарговыя задачы ў галіне падрыхтоўкі да новага навучальнага году і па выкананьню пляну ліквідацыі няпісьменнасьці.

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету т-ва «Прэч Няпісьменнасьць» пастанавіў пры канчатковай распрацоўцы пляну ліквідацыі няпісьменнасьці на бліжэйшы год выходзіць з таго, каб паставіць задачу поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць сярод рабочых гарадоў, савгасьнікаў, калгасьнікаў, сялянак-актывістак і моладзі нараджэньня 1908 г.

Пастаноўлена **з 1 верасьня абвясьціць месячнік паходу за грамату.**

Вырашана таксама больш стала прапрацаваць пытаньне аб мабілізацыі і падрыхтоўцы кадраў ліквідатараў. Пры складаньні пляну павінен быць улічан вопыт г. Саратава ў галіне адшуканьня сродкаў. Для больш пасьпяховага ажыцьцяўленьня пастаўленых задач стаць на шлях арганізацыі штабаў у цэнтры, акругах і раёнах, якія павінны кіраваць усёй працай па выкананьню пляну ліквідацыі няпісьменнасьці.

Пастаноўлена таксама 24-25 жніўня склікаць усебеларускую нараду з прадстаўнікоў т-ва „ПН" палітасьветы, прафсаюзаў і каапэрацыі для абгаварэньня пытаньняў аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году і аб правядзеньні месячніка за грамату.

Патрэбна мабілізацыя ўсёй грамадзкасьці.

(З ПРАМОВЫ тав. ЧАРВЯКОВА).

Пытаньне аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году пастаўлена вусім сваечасова, а можа, нават, і з некаторым спазьненьнем. Мы бачым, што падрыхтоўчая праца пакуль што ідзе павольным тэмпам, між тым навучальны год не за гарамі. У нас яшчэ ёсьць час падягнуць працу, ёсьць час да таго, каб добра падрыхтавацца і не нарабіць памылак мінулага году.

Самае важнае і асноўнае пытаньне —гэта ясна паставіць перад сабой задачу, што рабіць, якімі мэтадамі навесьці працу па ліквідацыі няпісьменнасьці ў надыходзячым навучальным годзе. Мінусамі нашых мінулых работ было: няяснасьць, расплыўчатасьць, неафармленасьць у нашых кадрах, у нашых сродках і ў мэтадах работы, а таму з году ў год мы мелі нездавальняючыя нас вынікі ў галіне такога бальнога фронту, як ліквідацыя няпісьменнасьці.

Цэнтральныя задачы ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці вызначаны ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б. Перад намі партыя паставіла задачы: ліквідаваць няпісьменнасьць у працягу году ў горадзе, у першую чаргу сярод рабочых, а таксама сярод рабочых савгасаў, сярод калгасьнікаў і сябраў прамысловых арцеляў, перад намі стаіць задача сёлета поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць сярод сялянак-актывістак і моладзі, якая ў наступным годзе будзе прызываецца ў Чырвоную армію. Да гэтага трэба дадаць наш 5-цігадовы плян ліквідацыі няпісьменнасьці і нам будзе ясна з чаго выходзіць пры распрацоўцы пляну на наступны год.

Выходзячы з вышэйсказанага мы можам у пляне на 1929-30 год арыянтыравана паставіць лічбу ў **250.000 чалавек**,—гэта прыблізна будзе складзена з тых катэгорый працоўных, што пералічаны вышэй і сярод якіх мы абавязкова павінны ліквідаваць няпісьменнасьць у наступным годзе.

Падыходзячы да разьвязваньня **пастаўленых** перад намі задач, мы павінны падумаць,—што мы маем, з якімі сіламі мы будзем весьці барацьбу з няпісьменнасьцю.

Наркамасьветы, таварыства „Прэч Няпісьменнасьць", прафсаюзы, камсамол і некаторыя іншыя арганізацыі,—вось на каго будзе ўскладзена вырашэньне задач па выкананьню пляну ліквідацыі няпісьменнасьці. Трэба падумаць над тым, каб правільна размеркаваць працу паміж гэтымі арганізацыямі, нам трэба падумаць аб падрыхтоўцы кадраў выканаўцаў пляну па ліквідацыі няпісьменнасьці. Нашы асноўныя кадры выканаўцаў—гэта наша настаўніцтва, якое, базумоўна, па прыкладу мінулых гадоў прыме актыўны ўдзел у непасрэднай працы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Але разам з тым трэба падумаць аб падрыхтоўцы дадатковага кадру ліквідатараў для выкананьня вялізарнага пляну будучага году.

Нам трэба для працы па ліквідацыі няпісьменнасьці скарыстаць сілы камсамолу, студэнцтва, вучняў старэйшых клясаў розных навучальных устаноў. Я лічу патрэбным стаць на шлях скарыстаньня ўсіх пластоў культурных працаўнікоў. Па гарадох у нас ёсьць шмат жонак, маючых вышэйшую і сярэднюю адукацыю, і якія сталі кухаркамі ў сваім быту, якія замкнуліся ў сваёй хатняй працы. Іх трэба ўцягнуць у грамадзкую працу і, у першую чаргу, у працу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Якія мы маем сродкі для ажыцьцяўленьня нашага пляну?

Сродкі, галоўным чынам, складаюцца з бюджэтных асыгнаваньняў па каштарысу Наркамасьветы, грошай таварыства «ПН» і прафсаюзаў. Зразумела іх мала. Нам трэба распрацаваць шэраг мерапрыёмстваў для адшуканьня новых сродкаў, трэба ў гэтай галіне выкарыстаць вопыт Саратава.

Далей перад намі стаіць пытаньне аб формах і мэтадах працы, з якімі мы павінны ўступіць у новы навучальны год. Тут таксама няма яснасьці, ёсьць многа спрэчных пытаньняў: ці ўстаць нам на прынцып платных лікпунктаў, ці працу па ліквідацыі няпісьменнасьці весьці па прынцыпу дабрахвотнасьці. Гэтае пытаньне трэба добра абмеркаваць.

Наступнае пытаньне—гэта аб нашым арганізацыйным пляне па правядзеньні кампаніі па ліквідацыі няпісьменнасьці. У мінулым мы назіралі шмат шуміхі, лішняй беганіны, неўпарадкаванасьці і гэтае адбівалася на ўсёй працы. Нам трэба мець месячныя пляны. У жніўні месяцы неабходна распрацаваць усебеларускі, акруговыя пляны, трэба весьці працу па вызначэньні пунктаў ліквідацыі няпісьменнасьці, трэба забясьпечыць месцы падручнікамі і рознымі дапаможнікамі. У верасьні неабходна наладзіць паход за грамату, вучэсьць няпісьменных і разьмеркаваць іх па лікпунктах, вучэсьць кадры ліквідатараў і прапусьціць іх праз курсы, заняцца пытаньнем аб адшуканьні сродкаў, мабілізацыяй усёй грамадзкасьці, **трэба дабіцца таго, каб з 1** кастрычніка абавязкова пачаць працу на лікпунктах.

Калі мы будзем мець такія канкрэтна распрацаваныя месячныя пляны, дык у нас будзе магчымасьць праверыць як яны выконваюцца на акругах і раёнах.

Н. Бяліна-Падгаецкі.

ЖЫЦЬЦЕ ЗАКЛІКАЕ.

(Апавяданьне).

I.

Дзікі рык некалькіх сот гармат напаўняў распаленае стрэлянінаю, выбухамі снарадаў, бомб і гранат павецра. Зямля стагнала і само неба чорнае ад дыму здавалася цяжкім і свінцовым.

Людзі, у фігурах якіх ня было нічога чалавечага, худыя ад недаяданьня, змораныя бяссонымі начамі, поўныя вошай і іншых паразітаў сядзелі ў глыбока вырытых у зямлі акопах, са спакоем прызвычаеньня прыслухоўваліся да завываньня агнёвай, прыносячай сьмерць і зруйнаваньні буры.

Вайна цягнулася ўжо каля двох з паловаю год. Цэлых трыццаць месяцаў мільёны людзей, груба вырваныя мабілізацыямі з іх сямейных ачагоў, адарваныя ад сваёй разумнай працы ў гарадох і сёлах—цэлых трыццаць месяцаў дзень і ноч сядзелі гэтыя людзі ў сырых вашывых акопах, забівалі адзін другога, умёралі і сьцёршы зубы цярпелі мукі ад хваляў атрутных газаў, ад крываточачых ран і калецтваў.

І здавалася людзям, што гэта вайна цягнецца ўжо цэлую вечнасьць, і здавалася ім, што ёй ніколі ня будзе канца.

— Праз тры дні зьмена, марыў нейкі малады салдат. Можна будзе памыцца ў лазьні і зьмяніць бялізну. Хутчэй-бы!

— Ну, да таго часу пакуль нас зьменяць, ты пасьпееш і на той сьвет напасьці, усьміхнуўся яму ў адказ другі. Вось як смаляць! Убачыш, сёньня ўначы будзе атака.

— Ня ўсіх-жа і забіваюць у акопах, умяшаўся ў размовы трэці. Я маю цьвёрдую надзею ня толькі памыцца ў лазьні, але і пайсьці ў водпуск да маёй Паліны.

— Вось зноў бабухнула, сказаў пасьля кароткага маўчаньня першы з гаварыўшых, пільна прыслухоўваючыся да глухога шуму ад бязупыннага разрыву снарадаў. Гэта дзесьці за фортам.

— Не, адказаў другі, гэта на вышыні сто трыццаць пятай. Так акурат пачынаецца падрыхтоўка да наступу.

— І калі-ж яна скончыцца гэта вайна праклятая? з сумам прастагнаў нехта ў цемры акопа. Так абрыдла!

— Скончыцца, калі мы самі ня будзем дурнямі, разлаваным голасам адказаў саракагадовы салдат Поль—той самы, што прадказваў на бягучую ноч атаку.

— Гэта-ж як? перапытаў яго малады салдат Густаў, які дзень і ноч толькі і марыў аб спатканьні ў чарговым водпуску з сваёй нявестай Палінай. Боши [1]) на нас наступаюць, яны хочуць зрабіць усю Францыю сваёй калёніяй. Нам нічога іншага і не застаецца як бараніцца!

— Боши, боши! перакрывіў яго Поль. Тут брат, справа зусім ня ў іх. Капіталісты надумалі гэту вайну для сваіх інтарэсаў, а вось мы, пралетарыят, павінны ўсё гэта на сабе выносіць!

Са здзіўленьнем слухаў Густаў незразумелую для яго гутарку Поля.

— Што за штука, думаў ён. Поль ня дурань... Наадварот ён здаецца мне вельмі разумным чалавекам. А між тым гаворыць вось ён нешта зусім незразумелае.

Кожны-ж добра ведае, што гэта бошы абвясьцілі нам вайну, уварваліся ў межы нашай краіны і вось ужо каля трох год як руйнуюць яе.

Чым-жа тут вінаваты капіталісты, хоць я як рабочы і ня вельмі люблю гэту банду эксплёататараў.

Не, трэба быць справядлівым. У даным выпадку вінаваты бошы і біць іх бязьлітасна абавязак кожнага сумленнага француза.

Так разважаў сам з сабой малады Густаў, рыхтуючыся ўступіць у гарачую спрэчку з саракагадовым салдатам другога ўзводу Полем Жырандэлем.

Але яму прышлося адкласьці гэтую спрэчку да другога разу, бо абставіны зусім не адпавядалі для філёзофскіх разважаньняў.

З глухім рыканьнем прапёсься над іх галовамі цяжкі снарад і, упаўшы ў некалькі кроках ад іх акопа, разарваўся.

Слуп агня зьмешаны з густым і едкім дымам высока ўзьняўся над зямлёй. Каскадам пасыпаліся ў французкія акопы кавалкі разарванага снараду, каменьні, кавалкі мёрзлай гліны.

Узвод пяхоты, які ахоўваў акоп не далічыў пасьля гэтага страшнага выбуху вельмі многіх сваіх таварышоў і сярод забітых быў і той малады салдат, якому так хацелася памыцца ў лазьні, і Поль Жырандэль, з якім так і ня скончыў сваёй спрэчкі Густаў.

Яны абодвы пакалечаныя, з вырваным нутром ляжалі ў чаканьні гадзіны свайго пахаваньня.

А вочы іх, ужо нічога ня бачачыя, нібы шкляныя, ўпарта ўглядаліся ў сьвінцовае неба, шукаючы там адказу на сваё зьдзіўленьне.

За што-ж загінуў я? быццам пытаў у неба Поль Жырандэль. Мне-ж непатрэбны ні сыравіна, ні рынкі, я-ж те канкурую ні з адным нямецкім фабрыкантам?

Вось табе і зьмена! здавалася папракала кагосьці тое, што толькі некалькі хвілін таму назад было жыцьцярадасным маладым салдатам. І памыцца ў лазьні не ўдалося! Эх-ма!

Але неба сьвінцовае і нахмуранае маўчала. Гарматная кананада ня спынялася, сеючы ўсюды сьмерць і зьнішчэньне.

II.

Лёгкі ветрык з усходу гнаў проста ў акопы смурод ад чалавечых і конскіх трупаў.

Ад гэтага паху салдат, што сядзелі ў акопах і чакалі там загаду ісьці ў атаку на ворага, нудзіла, у іх кружыліся галовы і едкая горкая сьліна цякла з роту.

Кананада ня спынялася. Наадварот яна толькі зараз дасягнула свайго кульмінацыйнага пункту, ад яе дрыжэла павецра, аглушаючы і прытупляючы ўсякую думку ў людзей.

Асобныя гарматныя стрэлы, асобныя выбухі бомб і гранат цяжка было адрозьніць. Гэта быў адзін цэлны гул—шалёны танец, які нёс за сабой калецтвы, сьмерць і разруху.

Людзі моўчкі сядзелі ў акопах, моцна сьціснуўшы ў руках свае вінтоўкі і чакаючы кожную хвіліну загаду выскачыць на брусвэр і кінуцца ў атаку ў начную цемру, каб здесьці там у гэтай-жа самай цемры стыкнуцца грудзі ў грудзі завостранымі штыкамі з такімі-ж, як і яны салдатамі толькі гаворачымі на іншай незразумелай для большасьці атакуючых мове, толькі апранутых у іншую не французкую вайсковую форму.

Цяжка сказаць аб чым думаў кожны з гэтых салдат у гэту апошнюю хвіліну перад сьмяротнай і для іх саміх, і для ворагаў атакай. Ці ўспомніў ён сваю сям'ю, пакінутую на ласку лёсу ў горадзе або ў вёсцы, ці марыў аб спатканьні з любай дзяўчынай, ці прабягаў думкаю ў апошнюю перад атакай хвіліну... ці...

Мабыць большасьць з салдат зусім нічога ня думала ў гэту апошнюю хвіліну. Аглушаныя бязупынна, з самай раніцы выкідаючы з сваіх жалезных жэрлаў патокі полымя гарматамі, ашалелыя і змучаныя, з узьнятай да апошняй магчымасьці ўсёй нэрвовай сыстэмай салдаты напаміналі сабой у гэтыя хвіліны несьвядомых вартых паважаньня людзей, а дзікіх разьюшаных псоў, якіх кожную хвіліну могуць спусьціць з жалезнага ланцугу.

Чакаць стоючы ў поўнай баявой гатоўнасьці ў акопе начатку атакі было значна цяжэй, чымся ўжо ісьці ў гэту самую атаку.

Усё, нават сьмерць была лепш гэтага даводзячага да вар'яцтва чаканьня.

— Праклятыя!—са злосьцю шаптаў скрозь сьцятыя зубы Густаў, стоячы з поўнаю абояў вінтоўкаю ў руцэ на дне зімнага і мокрага акопу. Хто іх прасіў прыходзіць да нас у Францыю з іх гарматамі і кулямётамі? Калі-б не яны, жыў-бы я сабе ў сваім Турку́эне, працаваў-бы на заводзе, ажаніўся-б з Палінаю. Вось жыцьцё было-б. А цяпер стой як дурань у гэтым праклятым акопе, ідзі ў атаку дзе можа заб'юць цябе як апошняе шчанё... У, праклятыя! Толькі-б дабрацца мне да вас, толькі-б дабрацца! Ужо я вам пакажу!

І ён моцна сьціскаў у руках сваю вінтоўку, нецярпліва чакаючы сыгналу да атакі.

— Хутчэй-бы ўжо!—бурчэў ён. І чаго марудзяць.

Прайшоў сэржант уздоўж акопаў запылены, зморань, з вялікімі ад бяссоньня сінцамі пад вачыма.

— Ну што, хлапцы, гатовы?—спытаў ён.—Зараз наступаць будзем. Сэнэгальцы [1]) ужо выйшлі з акопаў.

— Гатовы!.. Будзе!.. Ня нудзі!..—пачуліся з усіх бакоў хрыплыя і прыдушаныя галасы.

— Тады ўперад браткі!—сказаў сэржант, вымаючы з кабуры рэвальвэр і падымаючыся па зямляных сходках на брусвэр. Акопы бошай проста перад намі. Уперад!

Ланцугом рассыпаліся французкія салдаты і то залягаючы, то зноў перабежкамі пашлі ў атаку на засеўшага недзе там у цемры ночы ворага.

Уздымаліся рознакаляровыя ракеты. Грукатала артылерыя. Перастрэлка чулася часьцей і часьцей.

Вось ужо чорнаю ледзь значнаю ў цемры ночы істужкаю вырысоўваюцца нямецкія акопы... адтуль, выбухаючы там і тут агнёвымі кропкамі, нясуцца стрэлы.

І сеючы сьмерць у шэрагах наступаючых сьпяваюць сваю аднагучную песьню кулямёты.

— Уперад на ворага!—крычыць малады лейтэнант [2]), кідаючыся праз раскіданую артылерыйскім агнём драцяную загароду да акопаў ворага. Няхай жыве Францыя!

— Няхай жыве Францыя

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР.

Пра дапаўненьне складу Галоўнага Выставачнага Камітэту 1-й Усебеларускай Выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе ўвесьці ў склад Галоўнага Выставачнага Камітэту 1-Усебеларускай Выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці наступных таварышоў:

Нам. Дырэктара выстаўкі т. Таўкача, Леаніда Вікенцьявіча,
Нам. Дырэктара выстаўкі т. Грушэўскага, Аляксандра Ўладзіміравіча,
Заг. Аддзелу Жывёлагадоўлі праф. Найдзенава Мікалая Васільевіча,
Заг. Аддзелу лясной гаспадаркі і палявaньня праф. Мельніка, Сьцяпана Паўлавіча,
Заг. Аддзелу земляўпарадкаваньня праф. Некрасава, Тодара Рыгоравіча,
Заг. Аддзелу мэліярацыі і культуры балот Шыпэрка, Эдуарда Язэпавіча,
Заг. Аддзелу аграмаджанага сэктару—Старшыню Белкалгассаюзу Сьмірнова Яку Мікалаевіча,
Заг. Аддзелу мэханізацыі і электрыфікацыі праф. Вэйса, Ювінавія Аляксандравіча.
Заг. Аддзелу рыбаводзтва Тарасава, Пятра Аляксеевіча,
Заг. Аддзелу працы і быту ў сельскай гаспадарцы Мялешка, Міхася Яўхімавіча,
Заг. Аддзелу экспарту, імпарту і гандлю Нам. НК Гандлю Брамсона, Майсея Яўхімавіча,
Заг. Аддзелу прамысловасьці — Нам. Старшыні ВСНГ т. Стракоўскага, Уладзімера Канстанцінава,
Заг. Аддзелу сельска-гаспадарчага сэктару Лайко Мікіту Захаравіча,
Заг. Навукова - Асьветнага Аддзелу праф. Смоліча, Аркадзія Антонавіча,

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. Калевіч.

24 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Перад Усебеларускай вясковай спартакіадай

(Гутарка з сябрам арганізац. камітэту па правядзеньні спартакіады т. Грэокоўскім).

Падрыхтоўка скончана.

Уся падрыхтоўчая праца да ўсебеларускай вясковай спартакіады скончана. З вялікім посьпехам прайшлі райённыя спаборніцтвы, якія дапамаглі больш шпаркаму разьвіцьцю фізкультуры на вёсцы і асабліва ў савгасах.

З 10 па 12 жніўня па ўсіх округох Беларусі будуць праведзены округовыя спартакіады. Лепшыя ўдзельнікі будуць накіраваны на ўсебеларускую спартакіяду. Усяго ўдзельнікаў будзе звыш 200 чал. ад кожнай округі па 25 чалавек. Канчаткова зацьверджан судзейскі склад спартакіады, куды ўваходзяць 50 чалавек, у большасьці—кваліфікаваныя працаўнікі па фізкультуры.

ВСФК Беларусі ўжо зацьвердзіў парадак правядзеньня спартакіады.

У часе спартакіады.

18 жніўня арганізоўваецца вялікая масавая дэманстрацыя фізкультурнікаў Менску, прысьвечаная вясковай спартакіадзе.

ВСФК у час спартакіады арганізуе паказальную фізкультурную выстаўку для сялянскіх фізкультурнікаў. Да яе арганізацыі прыцягваецца спартыўнае вобчаства „Дынамо".

РВА ЦСПСБ і Дзяржвыдавецтва арганізуюць на спортпляцоўцы „Профінтэрн" базар кнігі па пытаньнях фізкультуры.

У часе спартакіады прафсаюзы і ВСФК праводзяць экскурсіі ўдзельнікаў на фабрыкі, заводы і культурныя ўстановы. Па тоўзе з Белдзяржкіно перад удзельнікамі будуць дэманстравацца спартыўныя кіно-фільмы.

Фізкультурнікі Менску да спартакіады падрыхтавалі паказальныя спаборніцтвы па гульнях, паказальнаму прабегу на вело-машынах і інш. Культадзел ЦСПСБ праводзіць 18 жніўня ў летнім садзе „Прафінтэрн" масавае гуляньне рабочых Менску і вясковых фізкультурнікаў—удзельнікаў спартакіады.

Спартакіада працягнецца 6 дзён: з 16 па 21 жніўня.

Урачыстае адчыненьне адбудзецца 17 жніўня ў памяшканьні Дому Селяніна а 8 гадзіне ўвечары.

Тэхнічнае абсталяваньне спартыўнай пляцоўкі саду „Прафінтэрн", дзе будзе праведзена спартакіада заканчваецца. На пляцоўцы ўстанаўліваецца радыё, па якой будзе перадавацца ход і вынікі спаборніцтваў.

ВСФК зацьверджана праграма спартакіады. Спаборніцтвы будуць праведзены па наступным відам спорту: лёгкая атлетыка (бег на 60, 100, 500 і 1000 мэтраў), мятаньне гранат, скачкі ў даўжыню і вышыню, штурханьне ядра, перацягваньне канату, пераход па браўну, ваенапалявыя гарадкі і гульні ў баскетбол.

Лепшым калектывам і асобным удзельнікам будуць выданы прэміі.

Прызы ўстаноўлены наступныя: імя ЦВК БССР—дзьве радыё-ўстаноўкі, ім. ВСФК Беларусі—поўны камплект лёгкаатлетычнага інвэнтару, імя ЦСПСБ—лыжы, імя газ. „Беларуская Вёска"—фізкультурная бібліятэчка. Акрамя таго, спартыўнае вобчаства „Дынамо" і цэнтральнае праўленьне саюзу с-г і лясных рабочых вызначылі з свайго боку прызы лепшым камандам.

Мабілізаваць увагу грамадзкасьці.

Спартакіада сялянскіх фізкультурнікаў у Беларусі праводзіцца ўпяршыню. Спартакіада—паказ дасягненьняў працы па фізкультуры сярод вясковых пралетарыяў. Яна мае асабліва грамадзка-палітычнае значэньне. Навакол спартакіады трэба мабілізаваць увагу ўсёй грамадзкасьці, у першую чаргу масавых арганізацый гораду і вёскі. Актыўны іх удзел забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне першай усебеларускай сялянскай спартакіады.

Ма.

СУД.

ГАНДАЛЬ ДЗЯРЖАЎНЫМ ЛЕСАМ.

Цярэнці Сымонаў Макрыцкі сябра партыі. Доўгі час быў беспрацоўным. Наведваючы партыйную арганізацыю Макрыцкі скардзіўся на беспрацоўе і прасіў паслаць яго на працу.

Калі ў Халопеніцкім лясьніцтве адчынілася пасада лясьніка і Макрыцкаму рапанавалі заняць гэту пасаду,—ён адразу згадзіўся і запэўніў партарганізацыю, што будзе служыць шчыра і сумленна.

Займаючы пасаду лясьніка Макрыцкі жыў добра: пэнсія, службовы надзел, апал здавальнялі ўсе патрэбы Макрыцкага.

Але хутка пашлі кепскія чуткі пра лясьніка Макрыцкага. Ня толькі ў лясьніцтве, але нават і на вёсках загаманілі аб пядбайнасьці і злоўжываньнях Макрыцкага.

Папершае—Макрыцкі за аховай лесу зусім не сачыў. Калі выпадкова Макрыцкі сустракаўся з парубшчыкамі лесу—іх не затрымліваў, пратаколаў не складаў, а толькі казаў „Хлопцы ўцякайце, а то кепска будзе".

А падругое — Макрыцкі лічыў сябе ўласьнікам дзяржаўнага лесу. Бяз ведама і згоды лясьніцтва Макрыцкі самастойна рабіў у лесе загатоўкі, прадаваў жэрдзі і дровы, а грошы клаў сабе ў кішэню.—За гэта злачынства Менскі акруговы суд засудзіў Цярэнція Макрыцкага на два гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, скараціўшы гэты тэрмін пакараньня па амністыі на палову

Ад пасады лясьніка Макрыцкі таксама адхілен.

Д. Кастроў.

ХРОНІКА.

Хроніка піанэрзьлёту.

Прыезд дэлегатаў піанэрскага зьлёту.

Учора ў Менск зьехаліся ўсе дэлегаты піанэрскага зьлёту.

На вакзале дэлегатаў сустрэлі арганізаваныя калёны атрадаў Менскіх піанэраў, а таксам акцябрат.

Дэлегаты разьмешчаны па рабочых кватэрах, дзе ёсьць піанэры.

Сустрэча ўдзельнікаў зьлёту.

Учора днём у летнім садзе „Профінтэрн" адбылася таварыская сустрэча ўдзельнікаў зьлёту з розных округ.

Дэлегаты дзяліліся ўражаньнямі аб аб працы сваіх атрядаў, аб чырвонай сталіцы і г. д.

Для дэлегатаў у садзе былі арганізаваны гульні ў кракет, пінг-понг.

Канфэрэнцыя неарганізаваных дзяцей Менску.

9 жніўня ўвечары, у памяшканьні летняга саду „Прафінтэрн" адчынілася першая Менская канфэрэнцыя неарганізаваных дзяцей. На канфэрэнцыю зьявілася звыш 900 дэлегатаў.

З прывітаньнем выступілі прадстаўнікі савецкіх, партыйных і грамадзкіх арганізацый.

Учора ў „Доме Культуры" адбыўся працяг канфэрэнцыі. Дзеці абгаварылі пытаньне аб піанэрскім зьлёце.

Канфэрэнцыя абрала 60 дэлегатаў па Ўсебеларускі зьлёт піанэраў.

1000 новых піанэраў.

1000 неарганізаваных дзяцей працоўных Менску выказалі жаданьне ўступіць у піанэры. З іх будзе арганізавана 20 новых піанэрскіх атрадаў.

* * *

Сёньня пасьля адчыненьня будзе наладжана для ўдзельнікаў зьлёту спэктаклі і вялікі канцэрт з удзелам лепшых сіл Менску.

Учора ў Доме Культуры ўдзельнікамі зьлёту быў паказан новы кіно-фільм вытворчасьці Белдзяржкіно „До завтра".

* * *

Дом санітарнай асьветы выдаў памятку для піанэра ў ліку 1000 экз. Гэта памятка будзе раздадзена ўдзельнікам зьлёту.

Усебеларускі мітынг фізкультурнікаў па радыё.

ВСФК Беларусі організуе 17 жніўня а 9 гадзіне ўвечары Ўсебеларускі сходмітынг фізкультурнікаў па радыё.

Мітынг будзе прысьвечан Ўсебеларускай вясковай спартакіадзе.

Рабочыя—да асеньняй пасяўной кампаніі.

Прэзыдыум ЦП Саюзу Тэкстыльшчыкаў распрацаваў канкрэтныя мерапрыемствы ўдзелу рабочых у асеньняй пасеўной кампаніі. На час кампаніі ў вёсцы будуць накіраваны рабочыя брыгады.

Зараз на больш буйных прадпрыемствах (ф-ка „Дзьвіна", „К. Цэткін", „Ім. 1-га мая") пачаўся збор сродкаў у дапамогу асеньняй кампаніі. Збор па папярэдніх даных дасьць звыш 1600 рублёў.

Абслугоўваньне трымацеляў пазык.

Белдзяржбанк арганізаваў у садзе „Профінтэрн" кіоск, у якім даюцца спраўкі па пазыках, выплачваюцца выйгрышы па апошніх і аплачваюцца купоны. У кіоску наладжана і прадажа аблігацый усіх пазык. Кіоск будзе працаваць па суботах і нядзелях.

418 аўтамашын для БССР.

Паводле вестак Аўтадору ў наступным годзе БССР атрымае 418 аўтамашын, з іх 40 аўтабусаў, 60—грузавікоў, а рэшта легкавыя машыны. Аўтадор даў заяўку ў Нар. Кам. Гандлю на 2500 замежных вэлёсыпэдаў.

Больніца на заводзе „Ноўка".

Згодна рашэньня НК Здароў'я адпушчаны неабходныя сродкі на пабудову больніцы на заводзе „Ноўка".

Пабудова больніцы будзе скончана ў гэтым годзе.

Распачаўся тыдзень торфу.

Дзеля правядзеньня тыдню торфу Наркамземам складзена камісія ў складзе таварышоў: Адамовіча, Бахцеева, Саўкіна, Міхайлава і агранома ад ЦК ЛКСМБ. Камісія наладзіла сувязь з акруговымі камісіямі па правядзеньню тыдню торфу, дзеля інструктаваньня і ўвязкі працы.

«Тыдзень торфу» павінен аб'яднаць працу ўсіх аграномаў і навуковых працаўнікоў у практычным ужываньні торфу, як паліва і як падсьцілкі ў сельскай гаспадарцы, у „Тыдню торфу" будзе надрукавана і распаўсюджана брашурка «Ўжываньне торфу на падсьцілку", а таксама іншыя віды літаратуры па тарфяному пытаньню ў БССР. Апрача гэтага, камісія, у часе «Тыдню торфу» мяркуе правесьці шэраг лекцый, гутарак на тэмы торфу, прыцягнуўшы да ўдзелу ў гэтай працы ўсю нашу савецкую грамадзкасьць. Камісія ставіць сваёю мэтаю арганізаваць вопытна-паказальныя вучасткі ў савгасах і калгасах дзеля ўжываньня торфу, як угнаеньня.

Работнікі мэдыцыны ў сацыялістычных спаборніцтвах.

З матар'ялаў аб удзелу работнікаў Мэдсанпрацы ў сацыялістычных спаборніцтвах відаць, што гэта пытаньне яшчэ недастаткова асьвядомлена, маюць месца выпадкі, пры якіх удзельнікі спаборніцтваў трымаюць у сакрэце свае мерапрыемствы па палепшаньні абслугоўваньня наведвацеля.

У спаборніцтві слаба ўцягнуты вышэйшы кваліфікаваны мэдыцынскі пэрсанал.

Нарада старшынь РГК, якая нядаўна адбылася пры саюзе адзначыла, што зусім слаба праходзяць спаборніцтвы ў раёнах.

Саюзам дадзены паказаньні аб разгортваньні спаборніцтваў сярод работнікаў мэдыцыны.

Набор у школу ФЗВ паперніцаў.

Прэзыдыум ЦП Саюзу Паперніцаў разьмеркаваў 50 месц у школу ФЗВ паперніцаў сярод сваіх прадпрыемстваў наступным параднкам: „Гэрой Працы"—14, „Чырвоная Зорка"—6, „Спартак"—8, „Сталіна"—2 і г. д.

16 месц у фабзавучы будзе абавязкова запоўнена дзяцьмі дзіцячых дамоў.

Прыём у школу канчаецца 25 жніўня.

Зьмяншэньне сабекошту і павялічэньне вытворчасьці

Паводле праэкту кантрольных лічбаў на папяровай прамысловасьці БССР на 1929-30 год прадугледжана павялічэньне вырабу супроць бягучага году на 21 проц., зьніжэньне сабекошту на 6,5 проц., павялічэньне вытворчасьці працы на 23,1 проц. Павялічэньне заработку на 6 проц.

Дзіцячыя ясьлі і пляцоўкі ў савгасах.

У бягучым годзе ў савгасах Беларусі адчынены ўжо 35 дзіцячых ясьляў і 15 асобных пляцовак. Зараз падрыхтоўваюцца да адчыненьня яшчэ 32 ясьлі.

ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых дагаварваецца з НК Ах. Здароўя аб адчыненьні ў гэтым годзе ў кожнай акрузе па адных гадовых дзіцячых ясьляў-пляцовак.

Прэзыдыум саюзу парашыў правесьці выбарачнае абсьледваньне працы дзіцячых ясьляў у савгасах.

Пабудова лекавых устаноў у Менску.

З будучага году ў Менску пачнецца пабудова будынку дзеля Санітарна-Гігіенічнага Інстытуту. На пабудову будзе адпушчана 150.000 рублёў.

6.500 тэхнічных аналізаў.

У лябалаторыі цэнтральнай тарфяной станцыі зроблена 6.500 тэхнічных аналізаў торфу з розных округаў БССР.

Фабрыка „Чырвоная Зорка"—на 7-гадзінны дзень

У наступным годзе намечана перавесьці на 7-гадзінны дзень працы папяровую фабрыку „Чырвоная Зорка".

САД АСЬВЕТЫ.

— Сёньня кіно „Право на жизнь" пачатак 9 г. 30 хв.

— Сёньня роўна ў 9 з пал. гадзін калектыўнае катаньне на вэлёсыпэдах для моладзі сяброў дому, збор у садзе „Профінтэрн, плата 15 кап.

Ад ЦКК КП(б)Б.

ЦКК КП(б)Б даводзіць да ведама членаў і кандыдатаў партыі, якія падалі апэляцыі ў ЦКК КП(б)Б, ці на паотановы КП(б)Б у ЦКК УсеКП(б), што разгляд іх спраў будзе вытварацца на мейсцы ў акруговых арганізацыях; аб часе выезду дзеля разгляду апэляцый і аб выкліку апэлюючых будзе дадзена абвяшчэньне праз КК і друк.

Таму ЦКК КП(б)Б папераджае аб непатрэбнасьці выезду т. т. у Менск, ці ў Маскву па пытаньнях апэляцый да асабога выкліку.

Сакратар ЦКК КП(б)Б Ляўкоў.

Да ведама

паступаючых у Беларускі Камуністычны Унівэрсытэт

Прыймовыя іспыты паступаючых у БКУ будуць праводзіцца з 22-га па 25 жніўня 1929 г.

Усе т. т., якія дапушчаны да іспытаў, павінны зьявіцца ў Менск (Унівэрсытэцкая 27), у вызначаны тэрмін а 10 гадзіне раніцаю.

У час правядзеньня іспытаў паступаючыя забясьпечваюцца інтэрнатам і харчаваньнем.

Праўленьне КУБ.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

АБВЕСТКА

Каб укараніць у побыт насельніцтва безнаяўныя разьлікі, якія прадстаўляюць значныя выгоды ў штодзённым грашовым звароце, у г. Менску ўводзіцца прыём платы за ваду і электрычнасьць у парадку жыразвароту (пералічэньне з рахунку ўкладчыка на рахунак Эльводу).

У зьвязку з гэтым з дня апублікаваньня гэтай абвесткі цяперашні парадак спагнаньня платы за электрычнасьць і ваду праз інкасатараў Эльводу

СПЫНЯЕЦЦА

Прыём платы будзе рабіцца ў галоўнай касе ашчаднасьці і ўсімі яе аддзяленьнямі, разьмешчанымі ў г. Менску.

Парадак спагнаньня платы ўводзіцца наступны:

1. Кожны абанэнт Эльводу забясьпечваецца кніжкай з адрыўнымі талёнамі на 14 месяцаў (да 1-га кастрычніка 1930 г.).

2. Кантралёр Эльводу штомесячна пры наведваньні ім абанэнта заносіць у кніжку апошняга разлік за бягучы месяц. Запіс у кніжцы робіцца ў 3-х экзэмплярах, з якіх адзін каляровы кантралёрам адрываецца з кніжкі і перадаецца ў Эльвод; калі абанэнт зьяўляецца ўкладчыкам касы ашчаднасьці, то другі экзэмпляр з адрыўным ярлыком пасьля падпісаньня яго абанэнтам перадаецца ў касу ашчаднасьці, прычым абанэнт паказвае на ярлыку № рахунку Эльводу і асабістага рахунку ў касе ашчаднасьці.

Другі экзэмпляр з ярлыком абанэнт можа перадаць непасрэдна ў касу ашчаднасьці, або апусьціць у кожную паштовую скрынку. Каса ашчаднасьці, якая атрымала вышэйпаказаны талён, робіць пералічэньне з рахунку абанэнта на рахунак Эльводу.

3. Абанэнты, якія не зьяўляюцца ўкладчыкамі касы ашчаднасьці, здаюць грошы непасрэдна ў аддзяленьне Галоўкасы ашчаднасьці № 1, Пляц Волі, 4. Пры ўплаце грошай абанэнты паказваюць свае абанэнтныя кніжкі.

4. Запазычанасьць за час да 1-га жніўня б. г. таксама прымаецца Галоўкасай ашчаднасьці і яе аддзяленьнямі па старых картках.

Эльвод. Галоўкаса ашчаднасьці БССР.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Дзяржаўнага Аб'яднаньня Лясной Экспартнай і Дрэваапрац. Прамысловасьці Беларусі „ЛЕСБЕЛ"

на 30-верасьня 1928 году.

АКТЫЎ.

Маёмасьць.		
1. Будынкі і пабудовы	1425735—09	
2. Абсталяваньне, машыны і інструманты	1566087 —	
3. Гаспадарчы інвэнтар	290701—03	
4. Транспарт	561605—20	
5. Маёмасьць фонду палепшаньня быту рабочых і служачых	314749—19	4158877—51
Запаснае абсталяваньне		154351—17
Незакончан. будынкі і капітальны рамонт у тым ліку па маёмасьці ФУБРУ—16358—01		2843738—61
Матар'ялы.		
1. Аспоўныя (лес на корані)	1424636—93	
2. Апал	26816—92	
3. Дапаможныя	979294—83	
4. Рамонтна-будаўнічыя	71606—78	
5. У дарозе	11236—22	2513591—68
Няскончаныя загатоўкі		600—53
„ вытворчасьць		3381808—80
Паўфабрыкаты		7150783—52
Тавары і гатовыя вырабы		9694982—09
Грашовыя сродкі (каса і бяг. рахун.)		543348—51
Працэнтныя паперы		442483—38
Паі і акцыі іншых прадпрыемстваў		431084—36
Уклады		
1. Уклады ў ОДК Прамбанку	80542—37	
2. Уклады на жыльлёвае будаўніцтва	439015—21	519557—58
Вэксалі і дакуманты да атрыманьня.		
1. Вэксалі да атрыманьня	2190379—45	
2. Вэксалі вучцёныя і блянкаваныя	6876078—59	
3. Вэксалі пратэставаныя	51066—25	
4. Дакуманты да атрыманьня	32761—39	9150285—68
Падсправаздачныя сумы		145617—99
Дэбіторы.		
1. Рабочыя і служачыя	201625—01	
2. Дастаўшчыкі і падрадчыкі, у т. л. па будаўніцтву. 512372—27	648943—42	
3. Пакупнікі	3810900—86	
4. Іншыя дэбіторы	1576097—67	
5. Няпэўныя даўжнікі	128483—22	6366050—18
Выдаткі будучых гадоў		1388470—81
БАЛЯНС		48885632—40

ПАСЫЎ.

Капіталы		
1. Статутны	15035423—22	
2. Рэзэрвовы	409070—87	
3. Амартызацыйны	503056—20	
4. Капітал пашырэньня прадпрыемства	158784—93	16106335—22
Фонды і рэзэрвы.		
1. Фонд па палепшаньню быту рабочых і служ.		675834—95
2. Рэзэрв будучых выдаткаў		430274—92
3. Рэзэрв па няпэўных даўгох		170810—31
4. Рэзэрв гарантыйных		301443—57
Доўгатэрміновыя суды.		
1. Па бюджэту	318420—77	
2. З ОДК Прамбанку	300000 —	
3. З Цэн. Кам. Банку	150000 —	
4. Па пазыцы гасп. аднаўленьня	497500 —	1265920—77
Пазыкі, ссуды і крэдыты.		
1. Банкі па спэц. бягуч. рахунк.		5183401—58
Вэксалі выдадзеныя, у т. л. па будаўніцтву 518896—84		1858389—80
Абавязацельства па блянкаадпісаньню.		
1. Банкі па вучоту вэксалёў	6402591—24	
2. Розныя асобы па блянк. вэксал.	473487—35	6876078—59
Крэдыторы.		
1. Рабочыя і служачыя	503322—53	
2. Дастаўшчыкі і падрадчыкі, у т. л. на будаўн. 148810—15	1923536—15	
3. Пакупнікі	4719581—42	
4. Незаплачаныя падаткі, зборы і абавязковыя ўзносы	5813798—97	
5. Розныя	1535548—31	14195787—38
Прыбыткі будучых гадоў		22967—72
Прыбытак справаздачнага году		1499087—59
БАЛЯНС	=	48885632—40

Забалянсаваныя артыкулы.

Маёмасьць, узятая ў арэнду	275855—53	Арэндадаўцы	275855—53
Гарантыйныя вэксалі, прынятыя ў забясьпеч.	496300—	Вэксалядаўцы пад забесьпячэньне	496300—
Коштоўнасьці, узятыя ў забясьпячэньне	6470—	Дэпаненты	6470—
Вэксалятрымацелі ў забесьпячэньне	7725184—89	Вэксалі выдадзеныя гарантыйныя	7725184—89
Тавары, прынятыя на хаваньне	71412—90	Камітэнты	71412—90
	8575223—32		8575223—32

ПА-ЗА БАЛЯНСАМ

1. Узнос маёмасьці на 1-X-25 г.	1.970.576—56
2. Астача амортызац. накапленьняў на 1-X-25 г., якія прылічаны да статутнага капіталу	186.592—10

Рахунак прыбыткаў і страт.

ДЭБЕТ.

Агульна-адміністрац. выдаткі	507210—86	
Гандлёвыя выдаткі	1924589—37	
Процанты выплочаныя	1237021—70	
Адлічэньні ў гарант. рэзэрв	146347—72	
Адлічэньні ў рэзэрв па няпэўных даўгох	14994—93	
Страты ад безнадзейных даўгоў	17955—54	
Розныя страты і выдаткі	1385309—45	
Прыбытак (сальда)	1498087—59	6731517—16

КРЭДЫТ.

Прыбытак ад рэалізацыі тавараў і паўфабрыкатаў		4177388—
Процанты атрыманыя		615862—93
Розныя прыбыткі		1938266—23
		6731517—16

Разьмеркаваньне прыбыткаў.

З выяўленага за справаздачны год прыбытку ў суме	1498087—59
Выключаецца ў выплату папрыбытковага падатку і на мясцовы збор (10 проц.)	149808—76
Застаецца	1348278—83
Адлічэньні ў В. Т. Н. У. (3%)	40448—36
Застаецца	1307830—47

Разьмяркоўваецца.

Рэзэрвовы капітал (10%)	130783—05
Ф. П. Б. Р. і Служ. (10%)	130783—05
У прыбытак дзяржавы (40%)	523132—19
О. Д. К. (10%)	130783—05
Капітал пашырэньня (25%)	326957—62
Фонд саніраваньня (4.75%)	62121—94
Фонд прэміраваньня (0.25%)	3269—57
	1307830—47

Кіраўнік Трэсту „Лесбел" ЕРАФЕЯЎ. **Галоўбух МАНЬСКІ.**

Гэты баланс, рахунак прыбыткаў і страт і разьмеркаваньне прыбыткаў зацьверджаны Прамплянам ВСНГ БССР (пратакол за 8-У № 103 і пастанова за 8-У) і да апублікаваньня дазволены.

Нам. Старшыні Прампляну ЛУР'Е.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Нядзеля 11-га жніўня
„БЕЛАЯ МОЛЬ" у 3-х дзеях АШКІНАЗІ.
ПАЧАТАК А 9-Й ГАДЗІНЕ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА", 3 аўторка, 6 жніўня „ХАБУ" Кіно-аповесьць у 6 частках. Пачатак а 8 гадз.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. 3 аўторка, 6 жніўня. Новы мастацкі фільм „ЛЕСЯ". Штодня 2 сэансы, пачатак: 1-га—9 г. 15 х. 2-га—10 г. 45 х. Каса а 7 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 3 дні 9, 10 і 11 жніўня. Грандыёзны мастацкі баявік „ТАНКРЭД І КЛЕРЫНДА"

КІНО ПРАЛЕТАРЫ „СУПРАЦІЎНІЦЫ" Бытавая драма ў 7 частках. пачатак а 7 з палов. гадз., каса а 6 г.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
Менск, Пляц Волі, 5 тэл. 5-63.
„КНІГА ПОШТАЙ"
ПРЫСЫЛАЕ пры атрыманьні усей сумы ДАРМОВА
ЛЮБУЮ — кнігу — ВЫСЫЛАЕ з наклаўнай аплатай.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Пасьведчаньне № 43 аб скончэньні смалявіцкай сямігодкі Папкоўскага І. А., кв. 812.
— Вучотна-конская карт. Лагуцкага Н. Г., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Дзенісевіча Н. Ф., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карта Корбута І. С., выд. Чэрвенекім РВК, кв 813.
— Вучотна-конская карт. Кірпіча Н. Н., выд, Багушэвіцкім ВВК, кв. 813.
Вучотна-конская карт. Гуткоўскага А. І., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Лучонка Н. А., выд. чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт, Беляева С.Н. выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Мірановіча Н. П., выд. Чэрвенск. РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Ігнація К. Г., выд. Чэрвенск. РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Піскунова П. В., выд. Чэрвенск. РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Сьвідзінскага І. К., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Курзіна К.Ц. выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
—Вучотна-конская карт. Арцішэўскага Г. Б., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Гарлоўскага А. В., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Сьвірыдовіча С. В., выд. Грэбенскім РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Седлікоўскага М., выд. Астраш.-гарадзецк. РВК. кв. 813
— Вучотна-конская карт. Бандарыка Е. С., выд. Чэрвенск. РВК, кв. 813.
— Вучотна-конская карт. Савіч М. Г., выд. Чэрвенск. РВК, кв. 813.
— Пасьведчаньне аб нараджэ. 1912 г Майбарода М. С., выд. Сьвірскім Загсам, кв. 492 п.
— Бюлетэнь а хваробе з 17-6-24-6 с-г. Давыдзенка Х. І., выд. зав. амбулят., кв. 492 п.
— Асабова вучотна вайсковая кніжка нараджэ. 1897 г. Рудзенка Ф. Г. Хамічскім РВК, кв. 492 п.
— Кніжка на атрыманьне дапамогі на кармленьня дзіцяці, выд. Рэчыцкай страхкасай на імя Цьвікілевіч Э. В., кв. 492п.
— Шлюбнае пасьведчаньне Герыловіч Е. П., выд. Рэчыцкім РВК, кв. 492 п.
— Вучотна-конская карт. Мурашка К. І., выд. Рэчыцкім РВК, кв, 492 п.
— Страхавы білет Бабіча Н. Н., выд. Рэчыцкай страхкасай, кв. 492 п.
— Пасьведчаньне аб нараджэ. 1912 г. Пілецкай М. А., выд. Рэчыцкім Загсам, кв. 492 п.
— Дзьве вучотна-конск. карт. Філімоненка В., выд. Рэчыцкім РВК, кв. 492 п.
— Картка на каня Суша Г. А., выд. Сьмілавіцк. РВК, кв. 813.
— Вучотна-кінская картка Ладулька Б. М., выд. Чэрвенск. РВК., кв. 813.
— Вучотна-конская картка Кузьміна В. П., выд. Чэрвенск. РВК, кв. 813.
— Вучотна конская картка Верына Б. М выд. Чэрвенск. РВК, кв 813.
— Вучотна-конская картка Войцыка Н. Д., выд. Чэрвенск. РВК, кв. 813.

Калоўлітбел 595.

Менск, дзяржаўная друкарня